PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 42 (2475) Год XLVIII | Беласток, 19 кастрычніка 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Ці будзе Польшча адвакатам Беларусі?

Ігар Гандлеўскі

Падчас візіту ў Беларусь маршалак Сената Польшчы Лёнгін Пастусяк, гаворачы на сустрэчы з журналістамі ў Мінску пра пашырэнне Еўрасаюза ды ўсталяванне ўзаемазразумення паміж Усходам і Захадам, выказаў вельмі цікавую фразу: „Мы можам узяць на сябе ролю адваката Беларусі".

Але спачатку (3 кастрычніка) маршалак Сената прыехаў у Гродна па запрашэнні актывістаў польскай дыяспары, якую здаўна патранує Сенат. А ўжо наступнага дня Л. Пастусяк паўдзельнічаў у афіцыйным адкрыцці помніка Адаму Міцкевічу ў Мінску.

У Гродне Л. Пастусяк наведаў сярэднюю школу № 36 з польскай мовай навучання, дзе меў гутарку з вучнямі і настаўнікамі. Затым сустрэўся з кіраўніком вобласці Уладзімірам Саўчанкам і старшынём гарвыканкама Аляксандрам Антоненкам. Цэлую гадзіну высокі госць з Варшавы прысвяціў спробе прымірыць асобных дзеячаў польскіх грамадскіх арганізацый Беларусі. Дзеля гэтага яму нават давялося ўнесці змены ў праграму візіту.

— Я звярнуўся да лідэраў польскіх суполак з прапановай захавання адзінства, — патлумачыў журналістам Л. Пастусяк. — Вельмі важна, каб яны супрацоўнічалі. Я незадаволены тым, што адносіны паміж лідэрамі такія, што яны не толькі не могуць супрацоўнічаць, але нават не могуць размаўляць паміж сабою.

Каб залагодзіць канфрантацыю паміж лідэрамі польскіх суполак, пра якую „Ніва" больш падрабязна пісала ўлетку (гл. артыкул „Працяг вайны ў Саюзе палякаў Беларусі", № 28 за 13 ліпеня 2003 г.), было вырашана арганізоўваць адмысловыя сустрэчы асноўных фігурантаў канфлікту ў... Генеральным консульстве Польшчы ў Гродне! Але гэта, калі скандал у Саюзе палякаў Беларусі даўно выйшаў за межы гэтай грамадскай арганізацыі ды набыў міжнародны розгалас, падаецца малаэфектыўным і загадзя безвыніковым.

Падчас сустрэчы маршалка Сената з прадстаўнікамі польскіх грамадскіх арганізацый Беларусі намесніца старшыні Гродзенскага аблвыканкама Марыя Бірукова абвясціла працэнтную колькасць палякаў у органах беларускай улады:

— Палякі складаюць 21,6% дэпутатаў мясцовых Саветаў у Гродзенскай вобласці. З васьмі членаў Савета Рэспублікі ад Гродзенскай вобласці тры — гэта палякі, з 13 дэпутатаў Палаты Прадстаўнікоў адзін з'яўляецца палякам. У дзяржаўных органах вобласці палякі складаюць 18,9% ад агульнай колькасці дзяржаўных службоўцаў.

[працяг ☞ 2]

Фота Ганны Кандрацюк

Справа: Катажына Філіпяк (дырэктар), Івона Лех, Ева Паплаўская, Ліля Герасімчык, Яўгенія Грушэўская (спераду)

У Залуках у грыбны час

Ганна Кандрацюк

Аўтобусам, разам з табуном грыбнікоў, еду на Гарадоччыну — у Залукі. У дарозе свойскія кліматы: вадзіцель ведае пасажыраў па імёнах і ўжо за Пяшчанікамі высаджвае па некалькі чалавек у лесе. Па дарозе мінаем дзядзькоў і цётак загружаных апенькамі і баравікамі.

— Ой, марозная зіма ідзе! — каментуюць грыбны ўраджай пасажыры.

У месцы, дзе звычайна ў аўтобусах вешаюць іконкі або рымскага папу, наш шафёр пачапіў значок з Пагоняй. А раптам, гэта прывід? — думаю пра апошняе. Аднак і на шыбе аўтобуса прызнак „свойскага" патрыятызму — плакат кандыдата ў сенатары Кшыштафа Біля-Ярузельскага ад СЛД.

Згодна з жаданнем, як тых грыбнікоў, аўтобус прывозіць мяне на месца, пад сам будынак школы ў Залуках.

— А мы ўжо чакаем! — вітае мяне Яўгенія Грушэўская з чайнікам у руках. Якраз перапынак. Усе гарадскія настаўнікі пазайздросцілі б цішыні на перапынках, якая ў параўнанні з гарадскімі, тут проста... анёльская.

— І нашы вучні даязджаюць рэйсавым аўтобусам, — кажа Катажына Філіпяк, дырэктар школы. Мова пра дзяцей з Пяшчанік, бо большасць вучняў і настаўнікаў жыве ў Залуках або ў лясных урочышчах, як дырэктар, якая за мужам лесніком патрапіла сюды аж з Познаньскага ваяводства.

— Уся наша ваколіца жыве з лесу, — адзначаюць спадарыні настаўніцы — хто лесніком, хто дрывасекам, хто ў тартаку работу мае.

Замест наракаць — спяваюць

Найбольш цікавіла мяне справа адраджэння тут беларускай мовы ў школе. Урокі ўзнавілі пасля пяцігадовага перапынку.

— Якім цудам? — пытаю, бо гэта першы такі выпадак у маёй дзевяцігадовай журналісцкай практыцы. Звычайна, калі ў нашых школах выводзілі мову, ніколі яна не вярталася. Хапіла маленькага расчаравання, каб раздзьмухаць агульную непрыхільнасць да „непрактычнай" спадчыны.

— Усё пачалося ад спеваў, — кажуць Яўгенія Грушэўская і Ева Паплаўская. Настаўніцы спяваюць у беларускім калектыве „Каліна".

— Нашы дзяўчаты спявалі найперш з дарослымі, разам ездзілі на агляды, выступалі. Каб не абмяжоўваць сябе

[працяг ☞ 3]

Фота Ганны Кандрацюк

Мяжа з форткамі ☞ 3

Палкоўнік Цэзары Залеўскі прызнаўся журналістам, што на ўсходняй мяжы ўжо неўзабаве стануць адмысловыя платы з датчыкамі і камерамі ды сістэмай радарных вышак. Будуць таксама расстаўлены партатыўныя датчыкі для г.зв. непасрэднага назірання.

Візы на мяжы сяброўства ☞ 4

Разам з развалам Савецкага Саюза парваліся эканамічныя сувязі паміж рэспублікамі — цяпер незалежнымі краінамі. Непазбежны стаў гаспадарчы і фінансавы крызіс, інфляцыя, разгубленасць постсавецкага грамадства. У Польшчы тым часам крамы і базары запоўніліся нават экзатычнымі прадуктамі. Праз мяжу, гэтым разам у заходнім напрамку, рушыла хваля грамадзян з постсавецкіх рэспублік.

У арлянскай школе ☞ 5

Школьнікі, апрача польскай, вывучаюць расійскую, беларускую, англійскую і, з гэтага года, украінскую мовы; для навучання апошняй удалося набраць толькі чатыры асобы. Няма праблемаў з навучаннем беларускай мовы, бо на агульны лік 246 вучняў родную мову вывучае 135 дзетак.

Каб ГДК быў універсальны ☞ 8

Намагаемся так арганізаваць працу дома культуры, каб маглі ім карыстацца людзі беларускай, украінскай і польскай нацыянальнасцей. Буду старацца, каб Гайнаўскі дом культуры быў універсальным. Буду намагацца, каб у час беларускіх мерапрыемстваў было крыху элементаў польскіх і ўкраінскіх.

Экуменічны апякун Белавежскай пушчы ☞ 9

Св. Яўстафія прызнаюць як католікі, так і праваслаўныя, што вельмі важнае на нашай змешанай нацыянальна і рэлігійна тэрыторыі. Лясную каплічку св. Яўстафія стварылі леснікі з верай, што будзе ён заступнікам усіх людзей, якія сваімі каранямі, прафесіяй і эмоцыямі звязаны з Белавежскай пушчай.

У бурштынавым кабінеце ☞ 10

Восенню 1941 года немцы сарвалі са сцен бурштынавае абсталяванне і вывезлі ў Кёнігсберг. Пасляваенныя пошукі бурштынавай комнаты не далі станоўчых вынікаў і ў 1979 годзе ўрад Савецкага Саюза прыняў рашэнне адбудаваць помнік. Аднаўленне комнаты працягвалася 24 гады (у XVIII ст. спецыялісты працавалі 11 гадоў).

Беларусь — беларусы

Ці будзе Польшча адвакатам Беларусі?

[1 ☞ працяг]

Але, на думку ганаровага старшыні Саюза палякаў Беларусі Тадэвуша Гавіна, калі няма свабодных выбараў, дык пра нейкае прадстаўніцтва палякаў у органах беларускай улады гаварыць увогуле не выпадае. Гэтыя лічбы складаліся з „савецкіх людзей", у чыіх пашпартах была некалі пазначана польская нацыянальнасць. І галоўная іх вартасць — лаяльнасць да ўлады, а не абарона правоў мясцовых палякаў.

Паводле апошняга перапісу насельніцтва на Гродзеншчыне пражывае 294 тысячы палякаў, што складае 24,8% ад агульнай колькасці жыхароў вобласці.

4 кастрычніка маршалак Л. Пастусяк разам з паслом Польшчы ў Беларусі Тадэвушам Паўлякам, старшынём Савета Рэспублікі Беларусь Генадзем Навіцкім ды іншымі афіцыйнымі асобамі прыняў удзел ва ўрачыстым адкрыцці помніка Адаму Міцкевічу ў Мінску. Па іроніі лёсу гэты помнік усталяваны непадалёк следчага ізалятара, так званага „Пішчалаўскага замка", дзе некалі чакалі прыгавору „касінеры" Кастуся Каліноўскага — удзельнікі Студзеньскага паўстання 1863 года.

На адкрыццё помніка Адаму Міцкевічу не прамінулі прыйсці прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі ды кіраўнікі апазіцыйных партый. Але, натуральна, выступіць ім ніхто не дазволіў. Усе падыходы да помніка, афіцыйных асобаў і мікрафонаў былі блакаваныя супрацоўнікамі спецслужбаў у цывільным. Тым не менш Л. Пастусяк пасля адкрыцця помніка адказаў на пытанні журналістаў. Ён зазначыў, што ягоны візіт нельга лічыць „прарывам" у беларуска-польскіх узаемаадносінах.

— Мы зацікаўлены, каб польска-беларускія стасункі развіваліся добра, у нас ёсць супольныя інтарэсы, як, напрыклад, рух праз мяжу, — сказаў маршалак Сената. — Добры эканамічны абарот у паўмільярда долараў... Нядаўна наша краіна звярнулася з прапановай быць пасрэднікам паміж Беларуссю і НАТА. Мы б хацелі, каб у хуткім часе Беларусь інтэгравалася ў Еўрасаюз. Шырэйшай будзе сфера еўрапейскай інтэграцыі, стабілізацыі і бяспекі... Мы можам узяць на сябе ролю адваката Беларусі.

Але ці захоча мець такога адваката найвышэйшае кіраўніцтва Беларусі? У сённяшняй сацыяльна-палітычнай сітуацыі гэта малаверагодна. Бо новая Еўропа не будзе трываць на сваім целе таталітарнага паразіта. Цяпер быць адвакатам Беларусі азначае апраўдваць поўнае здушэнне свабоды прэсы і дэмакратыі ў гэтай краіне.

Ігар Гандлеўскі

„Вяртанне Стэфана Баторыя"

Менавіта пад такой назвай 26 верасня ў Сенатарскай зале гродзенскага Новага замка адкрылася персанальная выстава мінскага скульптара Валерыя Калясінскага.

На адкрыцці выставы аўтар прызнаўся, што крыніцай творчай інспірацыі для яго стала замілаванне гісторыяй. А паколькі жыццё і смерць Стэфана Баторыя былі звязаныя з Гроднам, дык толькі ў гэтым горадзе выстава набудзе найвялікшы сэнс.

Экспазіцыю, якая складаецца з 19 прац, выкананых у гіпсе, чыгуне і бронзе, можна будзе сузіраць на працягу месяца. У асноўным — гэта скульптурныя выявы знакамітага караля Рэчы Паспалітай, звязаныя з некаторымі важнымі гістарычнымі падзеямі, а таксама рэльефы — алегарычныя сюжэтныя кампазіцыі.

Цікава тое, што дыпломнай працай Валерыя Калясінскага, як выпускніка Беларускай акадэміі мастацтваў, быў якраз помнік Стэфану Баторыю ў Гродне. І паставіць яго планавалася побач Фарнага касцёла. Аўтар ужо змайстраваў каркас, але на ўстаноўку помніка патрабуецца дазвол гродзенскіх улад.

Вацлаў Галімскі

100 гадоў Наталлі Арсенневай

21 верасня Таварыства беларускай культуры ў Літве адзначыла 100 гадоў з дня нараджэння Наталлі Арсенневай. У прыгожа прыбранай зале ТБК у Вільні былі выстаўлены партрэты Н. Арсенневай і кветкі. Пра жыццё і творчасць паэткі шырока і цікава распавяла настаўніца Леакадзія Мілаш.

Андрусь Старавойтаў праспяваў тры песні на словы Наталлі Арсенневай. Гімн „Магутны Божа" спявалі разам усе прысутныя стоячы. Свой верш, прысвечаны Васілю Быкаву, прадэкламавала Вера Хамянюк. 27 верасня ўся імпрэза была паказана па Літоўскім тэлебачанні.

Хведар Нюнька

Нашаму шматгадоваму карэспандэнту **Мікалаю ЛУК'ЯНЮКУ** словы шчырага спачування з прычыны напаткаўшага Яго гора — **смерці Сына Яўгена** — выказваюць рэдакцыйны калектыў і карэспандэнты „Нівы".

Новы закон аб СМІ

Беларускі парламент на сваёй восеньскай сесіі мае разгледзець доўгачаканы як унутры краіны, так і за яе межамі праект „Закону аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі". Цікава, што разгляд гэты прыходзіцца якраз на момант узмацнення ціску на няўрадавыя грамадска-палітычныя выданні, ды і ўвогуле грамадскую супольнасць.

Няма ніякай таямніцы ў тым, што справа са свабодай слова ў Беларусі, а дакладней яе адсутнасцю, стала адным з галоўных пытанняў да лукашэнкаўскай улады з боку міжнародных арганізацый. З-за таго з вялікімі цяжкасцямі даецца беларускім дыпламатам распавядаць аб тых „працэсах дэмакратызацыі", якія нібыта адбываюцца ў дзяржаве. Бо факты, як вядома, рэч упартая і сведчаць яны аб іншым. А менавіта, аб закрыцці незалежных газет (апошнім часам перасталі выходзіць больш за два дзесяткі няўрадавых выданняў), аб крымінальным перасследзе за прафесійную дзейнасць журналістаў (Маркевіч, Мажэйка, Івашкевіч), аб закрыцці няўрадавых арганізацый і рэсурсных цэнтраў, якія сваёй незалежнай дзейнасцю, між іншым, стваралі хай сабе кволую, але рэальную магчымасць станаўлення ў рэгіёнах краіны крыніц альтэрнатыўнай інфармацыі.

Самога праекта закону яшчэ ў парламенце няма, бо ўрад, а дакладней Міністэрства інфармацыі пакуль яго туды не перадаў. Як не перадаў і ў Савет Еўропы, што прынамсі, абавязаўся зрабіць яшчэ некалькі гадоў таму. Але цяпер аб факце такой перадачы сумнявацца не выпадае, бо аб законапраекце ва ўсю распавядаюць на самым вышэйшым узроўні і таму бачна, што ўвага да яго надзвычай высокая. Нават вышэй за вартую.

Пачынаючы ад беларускага прэзідэнта, па сваёй савецкай звычцы, мясцовае чынавенства бачыць у разнастайных законах не механізм рэгулявання той ці іншай дзейнасці, а сродак абмяжоўвання ўсялякай ініцыятывы, калі яна паходзіць не з уладных кабінетаў альбо з імі не ўзгоднена. Менавіта гэтым тлумачыцца патрабаванне А. Лукашэнкі ўзмацніць адказнасць за распаўсюд неверагоднай інфармацыі. У выніку за „неверагодную інфармацыю" выданне можа „атрымаць на арэхі" не толькі ад суда, як гэта было калісьці, але і ад пракуратуры, і ад Міністэрства інфармацыі. Папросту кажучы, ужо і гэтыя ведамствы набываюць права закрываць „непраўдзівыя" газеты.

Больш таго, да сродкаў масавай інфармацыі стаў належыць і Інтэрнэт. „Неверагодная" інфармацыя адтуль можа стаць недаступнай шляхам блакавання пэўных сайтаў. Такі выпадак у беларускай гісторыі быў 9 верасня 2001 года, калі да беларускіх сайтаў грамадска-палітычнай накіраванасці звычайнаму карыстальніку не было магчымасці выйсці, каб нешта даведацца аб ходзе прэзідэнцкіх выбараў. Дарэчы, менавіта за змест размешчанай у Інтэрнэце інфармацыі пацярпелі вышэйзгаданыя журналісты гродзенскай „Пагоні".

Не даюць спакою цяперашняму беларускаму прэзідэнту і ягонаму атачэнню расійскія СМІ, якія як нейкія страшэнна ўзброеныя ворагі Беларусі „прастрэльваюць" яе тэрыторыю, „падбухторваючы дэструктыўную стыхію" (вызначэнні цытаваныя з адпаведнай нарады ў А. Лукашэнкі). З таго ўсё менш і менш магчымасцей беларускаму люду глядзець тэлеканалы самага блізкага брата і саюзніка — Расіі. Бо на іх месца ўключаюцца толькі што ўзніклыя мясцовыя студыі і каналы. З аднаго боку такая „нацыяналізацыя" тэлебачання надае ўпэўненасці, што і беларусы не горш за расіян здольныя рабіць сваё тэлебачанне, але, з другога — дзе ж тым жа беларусам у сваёй краіне даведацца аб тым, што недаспадобы ўладам?

Па меркаванні многіх праваабаронцаў, няўрадавым СМІ варта рыхтавацца да дзейнасці ў падполлі, гэта значыць пераходзіць на пазіцыі існаваўшага калісьці ў СССР так званага „самвыдата". Але здаецца, што моцнага штуршка да зацікаўлення людзьмі незалежнай інфармацыяй гэта не прынясе — агульнае стаўленне беларусаў да падзей у краіне не змянілася з таго часу калі, вобразна кажучы, дыхаць было лягчэй. Яно застаецца на ўзроўні абыякавасці да ўсяго і, у першую чаргу, да ўнутранай палітыкі і эканомікі. Разам з тым, нешматлікіх беларускіх журналістаў-дэмакратаў такое становішча навучыць абапірацца толькі на ўласныя сілы і рэсурсы, не спадзеючыся на дапамогу звонку. Толькі ў такі, умоўна кажучы, „плюс" могуць пераўтварыцца шматлікія „мінусы" новага закону аб друку.

Уладзімір Лапцэвіч

60-я гадавіна бітвы пад Леніна

Нельга адбіраць славу салдатам, сказаў прэм'ер Лешак Мілер пад Леніна, дзе 12 кастрычніка адбыліся святкаванні 60-й гадавіны бітвы 1-й Дывізіі імя Тадэвуша Касцюшкі.

— Пасляваенная гісторыя і палітыка давялі да таго, што салдацкі подзвіг не заўсёды ўшаноўваўся належным чынам. Раз усхваляліся заслугі адных, іншы раз — другіх. Гэта так, быццам да пралітай за айчыну крыві можна было прымяняць розныя меркі — гэта не было ні справядлівае, ні разумнае; заўсёды было крыўднае і прыносіла непатрэбную горыч, — заявіў прэм'ер-міністр Польшчы ў сваім выступленні на ваенных могілках.

Прэм'ер Мілер дадаў, што салдаты дывізіі імя Касцюшкі адкрылі дарогу да Польшчы тым палякам, якія знаходзіліся яшчэ на тэрыторыі Савецкага Саюза. Выконваючы абавязкі прэм'ер-міністра Беларусі Сяргей Сідорскі і шэф польскага ўрада ўсклалі вянкі на магілах польскіх салдат.

Падчас урачыстасці на ваенным мемарыяльным комплексе адбылася кароткая сустрэча Лешка Мілера з прадстаўнікамі беларускай апазіцыі.

Набажэнства на могілках адслужыў палявы біскуп Войска Польскага генерал Славой Лешак Глудзь. Адбыліся таксама экуменічныя малітвы: пратэстанцкая і праваслаўная. Удзельнічаў у іх праваслаўны ардынарый Войска Польскага епіскап генерал Міран. Другая частка ўрачыстасцей адбылася ля Музея савецка-польскай баявой садружнасці.

— Гэта была наша супольная перамога; баявая слава двух народаў не павінна быць забытая, — сказаў прэм'ер Беларусі Сяргей Сідорскі да ўдзельнікаў святкаванняў і жыхароў Леніна.

Непасрэдна пасля заканчэння цырымоніі прэм'ер Мілер падаўся на аэрадром, скуль адляцеў у Польшчу. Перамоваў паміж шэфам польскага ўрада і яго беларускім калегам не было.

Паводле ПАП

Мяжа з... *форткамі*

Апошняя пагранзастава на тэрыторыі Падляшскага ваяводства ў рамках падрыхтоўкі да ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз была адкрыта ў Шудзялаве. Ва ўрачыстасці прыняў удзел міністр унутраных спраў і адміністрацыі Кшыштаф Янік.

Мабыць, выпадкова адкрыццё пагранзаставы ў Шудзялаве (канчатковы этап ушчыльнення ўсходняй мяжы) трапіла на 3 кастрычніка, у дзень трынаццатай гадавіны задзіночання Нямеччыны, з якой ужо праз паўгода Польшча не будзе мець мяжы.

— Гледзячы на Шудзялава, я хацеў бы, каб гэта быў знак нашай зусім новай палітыкі і сітуацыі, — сказаў міністр Янік. — Будуем шчыльную мяжу, але хацелі б, каб у ёй было больш *фортак*. Каб гэта не была мяжа, якая раз ды назаўсёды адгародзіць ад нас нашых суседзяў, сяброў і супрацоўнікаў. Будуем гэту мяжу не таму, каб паставіць тут вялікую сцяну, але каб пільнаваць і кантраляваць нашу і суседскую бяспеку.

У сваю чаргу камендант Памежнай службы ген. Юзаф Клімовіч у чарговы раз падкрэсліў:

— Ушчыльненне нашай мяжы ні ў якім выпадку не з'яўляецца пабудовай новай сцяны ў Еўропе і адмяжоўваннем сябе ад суседзяў.

Пазней у размове з журналістамі паінфармаваў аб ліквідацыі ў найбліжэйшы час некаторых пагранзастаў на мяжы з цяперашнімі і будучымі краінамі Еўрасаюза. Якіх — яшчэ невядома.

— Калі службоўцы з нашай заходняй мяжы не захочуць прыязджаць сюды, не буду іх да гэтага прымушаць. Цяпер практычна ўсіх новых пагранічнікаў накіроўваю на ўсход. Праз некалькі гадоў патрэбных нам будзе 30-40 працэнтаў сённяшняга саставу.

Пасвяцілі аб'ект у Шудзялаве ардынарыі Войска Польскага праваслаўны ген. епіскап Міран і каталіцкі ген. біскуп Славой Лешак Глудзь ды прадстаўнік Аўгсбургскага касцёла. Урачыстасці праводзіліся пры ўдзеле найвышэйшых улад рэгіёна і Шудзялаўскай гміны ды яе жыхароў, а таксама прадстаўнікоў афіцэрскага саставу памежных службаў Беларусі і Літвы.

Падляшскі ваявода Марэк Стшалінскі адзначыў:

— Я перакананы, што аддаючы ў рукі Памежнай стражы новую, знакамітую сядзібу, ствараем новую якасць міжнароднага супрацоўніцтва, супрацоўніцтва з Беларуссю, а таксама новую якасць жыцця ў Шудзялаве.

І дадаў, звяртаючыся да міністра Яніка:

— Для Падляшша добрыя адносіны з нашымі суседзямі — шанц на лепшы ўзровень жыцця. Для нас гэта лінія жыцця і прагрэсу, а не лінія абмежаванняў і перашкод у кантактах.

Палкоўнік Цэзары Залеўскі, адказны ў Памежнай стражы за справы сувязі, прызнаўся журналістам, што на ўсходняй мяжы ўжо неўзабаве стануць адмысловыя платы з датчыкамі і камерамі ды сістэмай радарных вышак. Будуць таксама расстаўлены партатыўныя датчыкі для г.зв. непасрэднага назірання. Ад будучага года ПС атрымае таксама новыя аўтамашыны з тэрмавізійным абсталяваннем. Маецца іх ужо 19, будуць дакуплены 46 штук. Да таго дойдуць тэрмавізійныя камеры абсягам у 2 кіламетры, якія зрэагоўваюць нават на дыханне.

Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

Злева: Епіскап Міран, біскуп Славой Лешак Глудзь і міністр Кшыштаф Янік

Пагранзастава ў Шудзялаве — васемнаццатая з дваццаці адной, запланаваных да адкрыцця на ўсходняй мяжы з 1997 года. Будуць тут працаваць 46 пагранічнікаў; тым часам тут іх больш за дзесяцёх. Маюць яны ахоўваць больш за 15 кіламетраў мяжы. Пагранзастава суседнічае на поўдні з заставай у Крынках, а на поўначы — у Кузніцы. Яе пабудова каштавала больш за 4 мільёны зл. На яе тэрыторыі — 8 кватэр. Аснашчана яна ў мадэрную сетку радыёсувязі, будынак з гаражамі, сваю алейную кацельню і генератар.

* * *

Незалежна ад закліку міністра Яніка да супрацоўніцтва і ўшчыльнення кантактаў шудзялаўскіх пагранічнікаў з мясцовым насельніцтвам, ужо ў час адкрыцця пагранзаставы дайшло да скрыгіту. Пад канец урачыстасці праз гучнагаварыцель жыхары Шудзялава былі запрошаны ў мясцовую школу пачаставацца з афіцыйнымі гасцьмі гарохавым супам і ўзнесці тост. Аднак, група жыхароў была затрымана ў фортачцы здаравякамі Бюро аховы ўрада (BOR). Як і, дарэчы, журналісты, ад якіх якраз BOR, як выявілася, меў абараняць спажываючага пачастунак шэфа ўнутраных службаў. Справа ў тым, што прадстаўнікі фродкаў масавай інфармацыі хацелі запытаць міністра пра адстаўку, у якую пайшоў у Варшаве Збігнеў Саботка і становішча апазіцыі ў справе магчымай адстаўкі самога Кшыштафа Яніка. Уцёкі міністра ад нявыгадных пытанняў абярнуліся супраць не хаваўшых абурэння ды стаяўшых перад школьнай брамкай жыхароў Шудзялава. Яны не ведалі, што тут адбываецца — толькі што іх запрасілі, а зараз жа потым паказалі дулю і пажадалі абысціся смакам. На канец, калі акружаны ахоўнікамі міністр збіраўся выходзіць, фортку перад школай адчынілі і „народу". „Народ", аднак, пайшоў сабе дахаты. І што маюць думаць у Шудзялаве аб фортках на ўсходняй мяжы, пра якія так шумна заяўляў у афіцыйнай прамове шэф унутраных службаў Кшыштаф Янік? (холм)

У Залуках у грыбны час

[1 ☞ працяг]

ў падборцы песень, каб не мяшаць галасоў дзяцей і бабуль, у Залуках падумалі пра дзіцячы беларускі гурт і назвалі як сваю кроўную галінку — „Калінкай". Услед за дарослымі дзеці ставілі тэатральныя спектаклі.

— Пачалі бываць у свеце, выступаць, заваёўваць узнагароды, — успамінаюць настаўніцы. — І тады зразумелі адно: каб выступаць і спяваць трэба ведаць беларускую мову! Вось і пачалі думаць пра навучанне. А бацькі, калі загаварылі пра ўсё на сходзе, адразу згадзіліся. Ды не адны праваслаўныя, у Залуках вывучаюць беларускую мову таксама каталікі.

— А адкуль у вас такія прыгожыя касцюмы? — пытаю, гартаючы старонкі школьнай хронікі.

— Самі пастараліся, — чую ў адказ. — Пашыла іх Валянціна Паплаўская — душа і завадатарка беларускай справы ў вёсцы.

Ідуць з духам часу

Пазайздросціць Залукам можна таксама камп'ютэрнага абсталявання. У школе сем камп'ютэраў і асобная зала для ўрокаў інфарматыкі. Навучанне гэтага прадмета вядзецца ўжо з першага класа.

— Мы самі знайшлі спонсараў, — кажа пані дырэктар. — Камп'ютэры падарылі нам фірмы да якіх мы звярнуліся з просьбай аб дапамозе. Праўда, нашы камп'ютэры не новыя, але яны добра служаць вучням.

У школе краязнаўчы і этнаграфічны міні-музей. Вядзе яго настаўніца гісторыі Івона Лех. Настаўніца родам з-пад Шудзялава, таму без цяжкасці можа назваць прадметы па-тутэйшаму: *маслабойка, капанька, рэшата...*

Звяртаем увагу таксама на стэнд прысвечаны Студзеньскаму паўстанню. На першым плане браты Сабалеўскія, паўстанцы з недалёкага Радуліна. У недалёкай Кнышынскай пушчы захаваліся магілы паўстанцаў. Апякуюцца імі гарцэры-скаўты.

— У мінулым годзе мы занялі першае месца ў конкурсе гарцэрскай песні, — кажа спадарыня Лех. — І гэта дзякуючы нашай „Калінцы", якая спявае таксама па-польску.

— А тут пішам пра нашага слаўнага ўраджэнца, — настаўніца гартае краязнаўчую хроніку. На старонках мастак Лёнік Тарасэвіч на фоне карціны-лесу.

Пад пагрозай ліквідацыі

На перапынку сустракаемся з навучэнцамі беларускай мовы. Пакуль запісаліся дваццаць асоб.

— А ці ўмееце размаўляць па-просту? — пытаю дзетак, якія з цікавасцю слухаюць пра „Зорку".

— Таааак! — крычаць хорам у адказ.

— A ja nie bardzo umiem, — перабіваецца нехта сола. Спадарыня Грушэўская сабрала ўжо патрэбныя кніжкі і дапаможнікі. Вучні таксама ў захапленні ад першых урокаў.

Але праблема ў чым іншым. Школа ў Залуках ад гадоў працуе пад пагрозай ліквідацыі. У 0-6 класах займаецца 45 вучняў.

— А колькі ў вас настаўнікаў?

— На штатах шэсць, — інфармуюць.

У Залуках не апусцілі рук, у школе прыкладны парадак і добрая для навукі атмасфера. Настаўнікі замест наракаць кажуць пра будучыню. Што ў сувязі з мяжой Еўрасаюза з Беларуссю, тут будуць аставацца маладыя сем'і. Бо нават ужо можна сказаць пра пэўныя пазітыўныя змены. Моладзь астаецца ў вёсцы, бо ў горадзе ўсё больш складана з працай і кватэрай.

За існаванне школы змагаюцца ўсе — тут не толькі асветная ўстанова, а свайго роду вясковы цэнтр культуры. Спяваюць калектывы, ставяцца тэатральныя пастаноўкі, святкуюцца вясковыя ўрачыстасці.

— На шчасце ўсё менш гаворыцца пра ліквідацыю школы, — настаўніцы ўспамінаюць сёлетнія дажынкі, у якіх актыўна ўдзельнічала школа. Войт, каб падзякаваць за ангажаванасць, пажартаваў:

— No, teraz to ciężko was będzie rozwiązać!

За здароўе вёскі

Пакуль вярнуцца ў Беласток (іншым) аўтобусам, але з тым жа кандыдатам у сенатары ў акне, прыслухоўваюся жыццю вёскі. Усюды цішыня, задбанасць, пустэча. Толькі праз вуліцу час ад часу пракоціцца цяжкі грузавік з драўнінай. Ды яшчэ пад крамай, дзе выстойваюць мясцовыя аматары выпіўкі. Страшна падыходзіць, хоць чую там шчырую беларускую гутарку.

Звяртаю ўвагу на незвычайную дэталь. У пачатку вёскі, дзе крыжы, беларускі надпіс лацінкай: *Za zdarowje Życielej wioski Załuki. Spasi nas Hospadzi.*

Дай Божа, хочацца пажадаць Залукам. І фатаграфую на ўсякі выпадак той надпіс: а раптам гэта прывід?!

Ганна Кандрацюк

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

На ўроку

Вачыма паляка

Як паляк з рускім

Напрыканцы кіравання Расіяй Міхаілам Сяргеевічам Гарбачовым правёў я чатыры гады ў Пецярбургу, тады, праўда, яшчэ Ленінградзе. Мае расійскія сябры кожны раз, калі я ехаў у Польшчу, заўсёды прасілі, каб я ім штосьці прывёз, а то касметыку, а то штосьці з адзення. Польскае значыла нават у былой сталіцы расійскай імперыі штосьці лепшае, чым можна было пафарсіць. Агромністыя чэргі станавіліся таксама каля польскай крамы ў Ленінградзе, некалькі тралейбусных прыпынкаў ад месца, дзе я жыў. Там сыходзіла ўсё, адразу пасля пастаўкі. Касметыка фірмы *Pollena-Uroda*, ласункі ад *Wedla* (тады яшчэ *22 Lipca*) мелі вялікую папулярнасць, яшчэ пасля майго выезду з Ленінграда, пасля путчу, у час Барыса Мікалаевіча Ельцына. Але ўжо тады, за познім Гарбачовым, у прыватных, паводле тагачаснага разумення прыватнасці, і ў г.зв. камерцыйных крамах з большым зацікаўленнем расіяне спаглядалі на тавары — тыя з краін далей на захад ад Польшчы, а найахвотней на тыя з-за акіянаў. Адтуль даходзілі таксама кнігі, якіх тады і ў Польшчы было не знайсці, хоць бы паэзія Іосіфа Бродскага.

Пачаў я тое ўсё прыпамінаць пасля павучальнага артыкула *Ruscy nie wszystko kupią*, які быў апублікаваны ў газеце *Rzeczpospolita* Марыюшам Машкевічам, былым польскім консулам у Гродне і паслом у Мінску. „Прымаецца, што рускі купіць усё, асабліва тое, чаго не ўдасца выпхнуць на Захад", — піша былы пасол, сёння дарадчык у Бюро гаспадарчай прамоцыі „Europa-Wschód" і асцерагае польскіх прадпрымальнікаў перад такой думкай. Найважнейшае, аднак: пазбыцца мышлення аб народах з-за ўсходняй мяжы ў пратэкцыйных, а нават і невуцкіх, ігнаранцкіх катэгорыях; аб „рускіх", значыць, аб расіянах, беларусах, украінцах, а нават аб армянах ці літоўцах.

Машкевіч прытым падкрэслівае, што сёння ўсходнія рынкі патрабуюць асаблівага чуцця і ведання рэалій. Дадае: „Патрэбны такія метады, як і ў развітых краінах: даследаванне рынку, маркетынг, рэклама, прамоцыя, удзел у кірмашах" (прытым не абы-які, але з заплеччам у форме, напрыклад, оптавых складоў з таго боку мяжы). Марыюш Машкевіч лічыць, што нізкія кошты рабочай сілы і доступ да танных рэсурсаў, пры доступе да тэхналогій і сродкаў вытворчасці раўняючыхся з польскімі, паўплывалі на тое, што атракцыйны і ў прыгожай тары тавар у Маскве, Кіеве ці Мінску гэта штодзённая справа. Усё часцей чуваць з таго боку акрэсленне-сінонім халтуры: „польская сасіска".

Калі я выязджаў з Ленінграда, як грыбы пасля дажджу сталі вырастаць, галоўным чынам паўз Неўскага праспекта, фірмавыя крамы з парфумай, вопраткай і да гэтага падобным фірмаў з захаду (на захад ад Польшчы). У Маскве адразу пасля выхаду з цягніка можна было ўжо тады з'есці гамбургер у Макдоналдсе. З таго часу прайшло ўжо 12 гадоў. Апетыты жыхароў Масквы, Мінска ці Кіева патанчэлі. Француз ці брытанец, а і паляк не мусяць забіраць з сабою ў падарожжа ў гэтыя сталіцы батарэю кансерваў, а і адзенне можа купіць на месцы, не горшае, а нават такое самае, па якое ходзіць у сваю краму ў Парыжы ці Лондане. Але ў польскім менталітэце далей дамінуе перакананне: „Рускі возьме ўсё за любую цану". А, вось, і не возьме! Мусяць аб гэтым памятаць меншыя і большыя прадпрымальнікі, што ездзяць рабіць гешэфты ў былы СССР.

Тым часам кончыўся 10 кастрычніка ў Гродне пяты ўжо шматгаліновы Кірмаш Еўрарэгіёна Нёман. Як напісалі ў інфармацыі, перасланай медыям працаўнікі Падляшскай маршалкоўскай управы, „мэтай выставы было пашырэнне гандлёва-гаспадарчых кантактаў паміж рэгіёнамі Беларусі, Літвы і Польшчы, згуртаваных у гэтым Еўрарэгіёне". А ці ўгадаеце, колькі польскіх экспанентаў прэзентавалася ў Гродне? Каб цяжэй было, скажу, што прадстаўлялася 41 беларуская фірма, а літоўскіх было шэсць. А з Польшчы з'явіўся... адзін экспанент. Рэшту падляшскіх прапаноў прадставілі ў каталогах і так вядомых ужо літоўскім і беларускім партнёрам. „Рускія" маглі паглядзець на польска-падляшскую прапанову на здымках. Ну дый супрацоўніцтва.

Мацей Халадоўскі

Візы на мяжы сяброўства

Яшчэ не так даўно польска-савецкую мяжу называлі мяжой сяброўства брацкіх славянскіх народаў. Аднак каб сяброўства не было надта блізкім, савецкія народы і палякаў раздзяляла заслона з калючага дроту і парусотметровая паласа памежнай зямлі, якой шчыльнасць па абодвух баках пільнавалі тысячы пагранічнікаў і іншых службаў. Раней беларусам, каб прыехаць у Польшчу і наведаць сваякоў, трэба было падацца ў Маскву і там аформіць патрэбныя дакументы. Выезд з Беластока ў Гродна напамінаў падрыхтоўку да экскурсіі вакол свету.

Пры канцы васьмідзесятых гадоў пачаў даваць трэшчыны Савецкі Саюз, а ў межах імперыі з'явіліся вялікія шчыліны. На яго тэрыторыю пачалі ўлівацца хвалі палякаў шукаючых там халадзільнікаў, тэлевізараў, вопраткі, гаршкоў, каўбасы, цукеркаў і ўсяго астатняга, чаго не было ў кіраванай генераламі краіне. Неўзабаве зусім лопнула структура савецкай дзяржаўнасці, галоўным злучальным элементам якой была палітычная паліцыя. Аказалася, што дзесяткі гадоў інтэграцыі пры дапамозе прапагандысцкіх, адміністрацыйных і паліцыйных сродкаў не аб'ядналі народаў.

Разам з развалам Савецкага Саюза парваліся эканамічныя сувязі паміж рэспублікамі — цяпер незалежнымі краінамі. Непазбежны стаў гаспадарчы і фінансавы крызіс, інфляцыя, разгубленасць постсавецкага грамадства. У Польшчы тым часам, у выніку рэформаў Бальцаровіча крамы і базары запоўніліся нават экзатычнымі прадуктамі. Праз мяжу, гэтым разам у заходнім напрамку, рушыла хваля грамадзян з постсавецкіх рэспублік. Невядома чаму на беларускіх мытнях дзяржаўныя службы прабавалі затрымаць гэты натоўп. Большасць турыстаў везла на базары Польшчы папяросы, спіртныя напіткі, каўбасу, сыр і прадукты металургічнай вытворчасці. Свае тавары прадавалі яны ўдвая танней чым у польскіх крамах, але, відаць, быў ад гэтага прыбытак. У Польшчы куплялі фальшаваныя джынсы, красоўкі, а ў палове дзевяностых гадоў амаль усё — ад мэблі да капусты. Пасажырскі цягнік Варшава — Масква запоўнены быў таварамі мясцовай вытворчасці з надпісамі на бірках „Made in Germany", „Made in England", аўтобусы італьянскай мэблі проста з рук беластоцкіх хаўтуршчыкаў. У Беластоку маланкава ўзнікла турыстычная база для абслугоўвання „рускіх". Начлег за дзесяць злотых (3 долары) можна было знайсці зараз каля базараў. У нашай „крэсавай крэпасці" з'явіліся надпісы на рускай мове, а мясцовыя рыцары пачалі размаўляць на „этом языке как истинно русския". З Лодзі і Варшавы не паспявалі пастаўляць прадукты на экспарт.

І тады ўпершыню ў Польшчы прыдумалі, што трэба рыхтавацца да інтэграцыі з Еўропай і пачаць кантраляваць рух людзей на ўсходняй мяжы. У 1997 г. з'явіліся ваўчэры і на базарах ды крамах для „рускіх" стала пуста. На вуліцу выйшлі беластоцкія купцы з пратэстам супраць рашэнняў улад закрываючых межы грамадзянам Беларусі і Расіі. „Рускія" сталі пажаданымі гасцямі, але некаторыя з іх, асабліва аптавікі, хутка памянялі вектары сваёй гандлёвай актыўнасці і падаліся ў Турцыю, дзе знайшлі яшчэ таннейшыя крыніцы тавараў. У Польшчы тым часам хутка лічылі затраты. Экспарт на працягу года скараціўся на 4 мільярды долараў. Гэта была сапраўдная катастрофа для беластоцкага гандлю і дробнай вытворчасці.

Маючы прыкры вопыт, у гэтым годзе палякі не надта ахвотна ўводзілі візавы рэжым. Нават адтэрмінавалі на 3 месяцы канчатковы тэрмін. У Беларусі з гандлю з Польшчай жыло пару соцень тысяч грамадзян. Польскімі прадуктамі запоўнены былі крамы і базары. У першых днях візавага рэжыму рух людзей на мяжы ўпаў амаль да нуля. Але, зразумела, будзе ён раскручвацца. Праз некалькі месяцаў праўдападобна ўсё вернецца да нормы, хаця затраты гандлюючых па абодвух баках — непазбежныя.

Візавы рэжым мае аднак другое вымярэнне. Дзеліць ён Еўропу на „нашых" і „не нашых". Сярод „нашых" праезд з краіны ў краіну ёсць нічым не абмежаваны. Выезд на ўсход гэта неабходнасць афармлення дакументаў, кантролю, затрата часу ў чаканні афармлення праезду і часта прыкрае стаўленне пагранічных ці мытных службаў. Усходняя мяжа заўсёды атаясамліваецца з не надта прыемнымі момантамі. Візавы рэжым толькі замацоўвае такі стан.

Яўген Мірановіч

Казначэйскі аддзел у Гайнаўцы

Намеснік міністра фінансаў Веслаў Цясельскі 6 кастрычніка ў Гайнаўскім беларускім музеі паінфармаваў аб рашэнні адкрыць у Гайнаўцы казначэйскі фінаддзел. Чыноўнікі Міністэрства фінансаў плануюць яшчэ ў гэтым годзе купіць офісныя памяшканні і з 1 студзеня 2004 года адкрыць казначэйскую ўстанову. Зараз самым надзейным месцам для фінаддзела з'яўляюцца пакоі аднаго з банкаў, бо не патрабуюць рамонтаў. Гайнаўскі фінаддзел будзе абслугоўваць падаткаплацельшчыкаў з усяго Гайнаўскага павета, а кантроль за прадпрыемствамі і прыватнымі асобамі надалей ажыццяўляць будзе Бельская казначэйская ўстанова. У новым аддзеле знойдуць працу жыхары Гайнаўкі і наваколля.

Віцэ-міністр Веслаў Цясельскі станоўча ацаніў працу казначэйскіх службаў. Эфектыўнасць іх работы ацаніў на 99,8%. На 6,5 тысячы судовых працэсаў казначэйская ўстанова прайграла толькі 129. У хуткім тэмпе пачалі разбудоўвацца кантрольныя службы, якія правяраюць прадпрыемствы і ліквідуюць ценевую эканоміку. Намаганні Міністэрства фінансаў будуць ісці ў напрамку паніжэння падаткаў і ліквідацыі льготаў.

Сабраныя пыталі, як міністэрства хоча затрымаць буйных падаткаплацельшчыкаў, якія пераносяцца ў іншыя краіны, і ці намерваецца аблажыць падаткам касцельную дзейнасць. Віцэ-міністр паінфармаваў, што з'яўляецца прыхільнікам падаткааблажэння касцельнай дзейнасці накшталт распараджэнняў, якія прымяняюцца ў заходніх краінах. Абараняў ён вялікіх плацельшчыкаў паясняючы, якія ў агульным сумленна плацяць падаткі.

Аляксей МАРОЗ

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Міністр Веслаў Цясельскі (справа) паінфармаваў аб рашэнні адкрыць у Гайнаўцы казначэйскі фінаддзел

Слава і багацце літаратурнай нівы Беласточчыны

(працяг; пачатак у 41 н-ры)

Усё гэта бясспрэчна. Але ў адным месцы можна тут нешта і ўдакладніць. На старонцы 365 манаграфіі А. Баршчэўскага „Творцы беларускага літаратурнага руху ў Польшчы. 1958-1998" мы чытаем: „Да ягоных (В. Шведа — У. К.) паэтычных бацькоў нельга было б залічыць М. Багдановіча, які ўжо ў перыяд „Нашае нівы" дэманстраваў сваю сімпатыю да таго варыянту мадэрнізму, які выступаў пад назвай імпрэсіянізм". У гэтай сувязі хочацца згадаць верш В. Шведа „На гарызонце лесу готык", пра які на стар. 375-376 манаграфіі сказана: „Гэта добры верш, без патрэбнай у паэзіі дэталёвасці і фатаграфічнасці. Верш, у якім мы маем дачыненне з рэфлексіўнасцю, а без рэфлексіўнасці не можа існаваць сапраўдная паэзія. Прыведзены верш мае ў сабе адну каштоўную ўласцівасць. Уласцівасць гэтая праяўляецца ў тым, што паэт зачыняе ў рамкі аднае арганічнае цэласці радасць і смутак. Радасць вынікае ў творы з вечнага хараства лесу, а смутак — з усведамлення прамінання, набліжэння старасці і непазбежнае смерці. Спалучэнне ў адно цэлае супрацьстаўных з'яў — гэта найвышэйшае паэтычнае ўменне. І якраз з гэтакім уменнем мы маем дачыненне ў прыведзеным вершы „На гарызонце лесу готык".

Добрая і заслужаная ацэнка. Але ў В. Шведа якраз і прасочваецца аналогія з вершам М. Багдановіча „... Выйшаў з хаты...":

Выйшаў з хаты. Ціха спіць надворак.
Наплывае радасць, з ёю — сум.
Не злічыць у небе ясных зорак,
Не злічыць у сэрцы светлых дум.

І тут мы маем спалучэнне радасці і смутку, якое абодва паэты перадаюць зусім самабытна, непаўторна, па-свойму.

Аналогіі тут можна шукаць і далей. М. Багдановіч, у сваю чаргу, як быццам бы ўступае ў творчае спаборніцтва з М. Лермантавым, аўтарам радкоў:

1
Выходжу один я на дорогу;
Сквозь туман кремнистый путь блестит;
Ночь темна. Пустыня внемлет Богу,
И зведла с звездою говорит.
2
.....
В небесах торжественно и чудно!
Спит земля в сияньe голубом...
Что же мне так больно и так трудно?
Жду ль чего? Жалею ли о чем?
3
Я ищу свободы и покоя!
Я б хотел забыться и заснуть!
4
.....
Я б желал навеки так заснуть...
5
Чтоб всю ночь, весь день мой слух лелея,
Про любовь мне сладкий голос пел,
Надо мной чтоб, вечно зеленея,
Темный дуб склонялся и шумел.

А калі звернемся да таго ж верша В. Шведа „На гарызонце лесу готык", то і там у заключнай страфе знойдзем нешта вельмі блізкае па адчуванні:

Мо лепш на вечны адпачынак
З карэннем дрэваў мне зрадніцца.
Магутнай прарасці ялінай
І ап'яняць людзей жывіцай.

Мы можам смела гаварыць, што ў В. Шведа пераймання або запазычвання няма, усё тут выразна сваё, непаўторнае, народжанае побытам у пушчы, яе спрадвечным хараством, якое не можа не зачароўваць чалавека. І тым не менш і ў яго, і ў Лермантава ёсць няўлоўна блізкае ў духу і ў паэтычнай форме выяўлення пачуцця вечнай злітнасці чалавека з прыродай. Гэта — адзін з пераканаўчых прыкладаў і доказаў таго, што паэзія „белавежцаў" арганічна ўліваецца ў шырокі, не абмежаваны ні ў часе, ні ў вузкай нацыянальнай прасторы літаратурны працэс.

У гэтай сувязі варта згадаць абгрунтаваны вывад А. Баршчэўскага, зроблены ў раздзеле, прысвечаным творчасці Янкі Чыквіна: „Можна думаць, што Я. Чыквін, нягледзячы на такія ці іншыя сімпатыі да акрэсленых пісьменнікаў, досыць эфектыўна бароніць сваю літаратурную аўтаномію. Сказанае не абазначае, што ён, так як і кожны іншы паэт свету, у меншай ці большай ступені не скарыстоўвае таго, што ўжо створана дагэтуль у літаратуры. Поўнай чысцінёй і абсалютнай незалежнасцю ў гэтай галіне, мабыць, не можа пахваліцца ніводзін паэт свету. Чужое ўрываецца ў нашу творчасць таксама тады, калі мы аб ім не думаем, а нават тады, калі аб ім думаем і ад яго баронімся. Мабыць, ніводзін з паэтаў не можа сказаць, што поўнасцю ягонае, а што — часткова чужое" (с. 301).

Што ж датычыць ідэйна-творчых асаблівасцей паэзіі Я. Чыквіна, то істотная сутнасць яе дастаткова выразна вызначана яшчэ ў пачатку манаграфічнага раздзела, прысвечанага паэту. Гэтае меркаванне заслугоўвае таго, каб яго выдзеліць: „Калі б трэба было абавязкова шукаць крытэрыі падзелу паэзіі Я. Чыквіна, дык можна было б усю яго творчасць падзяліць на дзве групы: у першую ўвайшлі б тыя вершы, якія яму нашапталі сялянскае паходжанне, вясковае дзяцінства, пачуцці да бацькоў і блізкіх. Другую групу сфармавалі б вершы, якія вядуць свой радавод з літаратуры, а можа лепш сказаць, з роздумаў, што з'яўляюцца вынікам адукацыі і тае культуры, якую дае чалавеку безупынны кантакт з кнігай..." (с. 301). Гэтым тлумачыцца і такая асаблівасць яго паэзіі, што ў паасобных вершах „ён любіць свайго роду засакрэчанасць, якая, мабыць, не спрыяе шырокай папулярнасці ягоных вершаў ва ўсходнебеластоцкага чытача, прывыклага да канонаў чыстатрадыцыйнай паэзіі. Вельмі часта гэты паэт карыстаецца намёкам і паўсловам, лаканічнымі ды паэтычнымі сродкамі, якія не заўсёды ствараюць просты ды прасторны шлях, які вядзе чытача да паэта" (с. 322).

Калі працягваць гаворку пра паэзію, то самабытнае месца ў ёй заваяваў Дзмітрый Шатыловіч, творчасць якога ў нечым вельмі блізкая да творчасці Віктара Шведа. Такой яна бачыцца і многім чытачам, і аўтару манаграфіі, які мае ўсе падставы, каб пісаць: „Усе ягоныя вершы моцна абапіраюцца на фундамент рыфмы і рытму, на канву правільнай страфы, у якой амаль выключна рыфмуецца першы радок з трэцім і другі з чацвёртым" (с. 344). Асаблівай увагі заслугоўвае вывад даследчыка адносна ролі і месца абодвух паэтаў у літаратурным жыцці Беласточчыны: „Вяртаючыся да паняцця паэтычнае амплітуды, у якой змяшчаюцца ўсе беларускія паэты пасляваеннае Польшчы, трэба падкрэсліць, што Дз. Шатыловіч стаіць побач з В. Шведам, бацькам літаратурнага традыцыяналізму.

Нам здаецца, што паэзія Дз. Шатыловіча добра служыць нацыянальным мэтам, чалавечай шчырасці і чалавечай сардэчнасці, без якіх жыццё кожнае нацыі было б убогім і аднабаковым" (с. 344).

Усё гэта так. Але ў сувязі з разглядам творчасці Дз. Шатыловіча і ўдумлівым аналізам яго паэзіі хацелася б звярнуць увагу на адну акалічнасць. Ён з'яўляецца аўтарам добрых і цікавых вершаў пра тыя гарады і мясціны чужых краін, у якіх яму давялося пабываць. Тут і славуты Луўр, і Стамбул, і Эгейскае мора, і Грэцыя з Тэрмапіламі, Марафонам, Дэльфамі. І ён адважыўся напісаць верш пра Марафон. У польскай літаратуры надзейнае месца заваявала хрэстаматыйная паэма Карнэля Уейскага „Марафон". І магло б уяўляцца, што пасля яго брацца за гэту тэму ўжо ніхто не даў бы рады, каб напісаць нешта самабытнае і такое, каб яно чыталася. Аднак і ў Дз. Шатыловіча нарадзіліся цікавыя радкі:

Закрыўшы вочы, чую мужны
І сэрцаў стук, і тупат ног,
Дыханне, нібы мех у кузні,
І звонкі кліч і гучны рог.

І віскат стрэл з персідскіх лукаў,
І бег фалангі, нібы гром,
І звон жалеза, енкі ў муках,
І раптам крык з усіх старон:

„Разбіты вораг! Перамога!" —
Бяжыць з навінай Філіпід
У цэнтр Афін. Дрыжыць дарога,
Дрыжыць знаёмы краявід.
.....
Прынёс вясёлую навіну
І выдаў свой апошні стогн —
Легенду па сабе пакінуў
І алімпійскі марафон.

(заканчэнне будзе)

Уладзімір Казбярук

У арлянскай школе

У Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Орлі навучальны год 2003/2004 пачалі 272 вучні. У школе вядзецца навучанне пяці мовам, вучні практыкуюцца на шматлікіх пазаўрочных занятках, якія настаўнікі вядуць на грамадскіх пачатках. У час канікул у агромным школьным будынку быў часткова абноўлены паркет.

Будынак арлянскай школы быў здадзены ў карыстанне 12 снежня 1992 года. Школьнікі вывучаюць, апрача польскай, расійскую, беларускую, англійскую і, з гэтага года, украінскую мовы; для навучання апошняй удалося набраць толькі чатыры асобы. Няма праблемаў з навучаннем беларускай мовы, бо на агульны лік 246 вучняў (без нулявога класа) родную мову вывучае 135 дзетак. У школе вядзецца праваслаўная і каталіцкая катэхізацыя. Працуюць два інфарматычныя кабінеты з дваццаццю камп'ютэрамі; у ліку апошніх — два настаўніцкія. У рамках пазаўрочных заняткаў дзейнічаюць Еўрапейскі клуб, вакальны калектыў, маладзёжны хор, гарцэры, зухі, спартыўная каманда і матэматычны гурток.

З большасці вёсак гміны дзяцей у школу возяць два аўтобусы; толькі школьнікі з Орлі, Міклашоў і Кашалёў не карыстаюцца гэтым транспартам. На жаль, у некаторыя вёскі школьны аўтобус ужо не заязджае і іх лік будзе рос. У нулявым класе вучыцца 26 дзяцей, сярод іх няма нікога з Рудутаў, Шчытоў-Дзенцялова, Спічкоў, Тапчыкал і Москаўцаў. Агулам найбольш дзяцей з самой Орлі — 102, з Маліннік і Кашалёў — па 23, Дыдуль — 16, Крывятыч — 14, Шчытоў-Навадвораў і Міклашоў — па 13, Пашкоўшчыны — 12, Вулькі-Выганоўскай — 10, Рудутаў — 9, Градалёў — 7, калёніі Градалі — 6, Спічкоў і Шчытоў-Дзенцялова — па 5, Рыгораўцаў і Шарнёў — па 4 ды Тапчыкал і Москаўцаў — па 2 дзетак. З агульнага ліку ў пачатковай школе вучыцца 172 вучні, а ў гімназіі — 74.

Міхал Мінцэвіч

Фота Янкі Целушэцкага

Захапленне Славаміра Куліка

Славамір Кулік жыве ў Гайнаўцы, настаўнічае. Калі з'явіцца ў яго натхненне, піша вершы або фатаграфуе. Гэта яго захапленні, якім прысвячае свой свабодны час. Фатаграфія для яго — уцёкі ад штодзённасці. Найбольш любіць здымаць прыроду, старую вясковую архітэктуру, цэрквы з багатай арнаментоўкай, упрыгожаныя ўзорыстай разьбой.

Мае ён свае ўлюбёныя поры года. Калі ідзе цераз Белавежскую пушчу, тут заўважае, што вартае ўвекавечання. Падказвае яму інтуіцыя, творчая схільнасць. Важна таксама, у якую пару дня найлепш фатаграфаваць нейкі аб'ект або ўсё тое, што прыцягнула ўвагу, прычаравала. Неаднойчы ў тое самае месца збіраецца на „паляванне" другі раз. Вядома ж святло — яно мастак у фатаграфіі.

Славамір Кулік дагэтуль меў выстаўкі сваіх фотаздымкаў, між іншым, у Педагагічнай бібліятэцы ды ў Белліцэі ў Гайнаўцы.

З кастрычніка падрыхтаваў з размахам так бы мовіць багатую фотавыставу п.з. „Блізка натуры" ў гайнаўскім Беларускім музеі, па вул. 3 Мая, 42. Запрашаем глядзець яе кожны дзень у гадзінах працы Музея.

Янка Целушэцкі

Зорка

старонка для дзяцей

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Навучэнцы беларускай мовы ў Залуках з настаўніцай Яўгеніяй Грушэўскай

Вершы Віктара Шведа

Пайшло на пяцёрку

Спытаў бацька абібока:
— Як пайшло табе на ўроках?
Таце адказаў Рыгорка:
— Пайшло сёння на пяцёрку.

Двойку ўляпіў матэматык,
Другую гісторык заўзяты,
Потым яшчэ праз гадзінку —
Паланіст мне даў адзінку.

Хто хоча ісці ў неба?

— Пазнаваць нам, дзеці, трэба
Закону Божага сакрэты.
Хто хоча з вас ісці ў неба? —
Настаўнік запытаўся гэтак.

— Чаму ты, дарагі Адаме,
Адзіны не пацвердзіў згоды?
— Даў слова сёння сваёй маме
Прыйсці дахаты, як заўсёды.

Ніна Мацяш

Валавока

— Чэр-р, чэр-р, чэр-р,
чэр-р, чэр-р, чэр-р... —
Чуецца навокал.
— Коце, зубак не шчэр-р, —
Кажа валавока. —
Я ў ламачча ўпаду,
Як малы арэшак,
І бяду адвяду,
І сяброў пацешу!

PS. Валавока інакш — арэшак — пеўчая птушка сям'і вераб'інападобных

Ці прагнеце быць слаўнымі і прыгожымі?

Прывітанне, дзяўчаткі і хлопцы! Найперш — чым прачытаеце гэты тэкст — адкажыце сабе на пытанне: Ці прагнеце стаць лепшымі, прыгажэйшымі? Вопытнымі і разумнымі? Паважанымі і каханымі? А ў будучыні, напрыклад, выступіць як зоркі ў дэкламатарскіх, тэатральных, літаратурных або мастацкіх аглядах? Або на рок-фестывалі „Басовішча". Калі так — паслухайце.

Няма лепшага настаўніка за кніжку. Час мяняецца, карыстаемся тэхнікай і Інтэрнэтам, аднак — кніжка далей застаецца найкаштоўнейшым дапаможнікам. Са свайго боку хачу зацікавіць вас нашай літаратурай. Беларускай кніжкай! Якраз, калі ідзе пра дзіцячую літаратуру, у нас ёсць вялікі выбар. Цудоўныя легенды і казкі, дзіцячыя апавяданні, вершы. Літаратура для моладзі і дарослых. Іншая справа — яе складана знайсці. Не заўсёды такая літаратура будзе ў вашых школьных бібліятэках. Давайце тады разам падумаем, як рашыць гэтую праблему. Чамусьці ў вашых беларускіх кабінетах першае месца займае этнаграфія? А чаму, вось, не збіраць беларускіх кніжак, а пасля, як у бібліятэцы — не пазычаць іх дадому? І, напрыклад, прачытаць казачку маленькай сястрычцы або зрабіць сюрпрыз маме, дзедку або цёці?

Спытаеце: А адкуль жа нам узяць гэтыя кніжкі? Вось і падказка: напэўна, у многіх у хаце ёсць прачытаныя і ўжо „непатрэбныя" кніжкі ды часопісы. Можна іх пазычыць сваёй школьнай бібліятэчцы або падарыць. Можна напісаць беларускім арганізацыям, або ... выйграць у нашых КОНКУРСАХ!

Вось з гэтага нумара прапануем вам літаратурна-краязнаўча-гістарычна-геаграфічны конкурс. Вашай задачай будзе адказаць на пытанні і адказы даслаць у рэдакцыю. Можаце ўдзельнічаць цэлым класам або школай (ну і, вядома, індывідуальна).

Першае пытанне з літаратурнага польска-беларускага памежжа. Кожны з вас прачытаў або будзе яшчэ чытаць раман „Над Нёманам" Элізы Ажэшкі. Адкажыце тады на пытанне, дзе адбываецца дзея кніжкі:

а) у Беларусі на Гродзеншчыне,
б) у Літве на Віленшчыне,
в) у Польшчы ў наваколлі Чанстаховы.

Адказы дасылайце на працягу трох тыдняў.

Жадаю поспехаў і хацелася б мне думаць, што прапанову палічыце цікавай.

Пра нашу акцыю будзем пісаць у „Зорцы". Не хвалюйцеся, калі першыя вашы артыкулы будуць апавядаць пра абыякавы або варожы падыход школьных сяброў да беларускай кніжкі! Гаварыце пра гэта. Дарэчы, можа з гэтага атрымацца цікавая тэма для артыкула.

Тады паехалі!..

Ганна Кандрацюк

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Барбара

Са школы ў Семяноўцы прыехала Бася Шусцік. Дзяўчынка падрыхтавала верш Станіслава Шушкевіча „Генерал верабей". Ужо з першых слоў адчувалася незвычайнасць выканання. Бася, хаця дробненькая, як той верабейка, па-генеральску справілася з тэкстам. Яе выкананне адзначалася дынамікай, рашучасцю.

Барбара — лаўрэатка першага месца цэнтральнага конкурсу „Роднае слова 2003". Узнагарода ўцешыла не толькі дэкламатарку. Разам пабывала яе настаўніца беларускай мовы Ліля Тарасевіч, і яна, не менш за дзяўчынку, перажывала выступленне.

Зорка

Казкі дзяцей Беларусі

Вавёрчыны арэшкі

Аднойчы прыйшла да зайкі вавёрка і кажа:

— Пачастуйся, зайка, арэшкамі. Я сама іх збірала ў нашым лесе.

— Не, не хачу я арэшкаў, — адказаў зайка і заплакаў: — У мяне зубок баліць!

— А ты пашчоўкай арэшкі і палечыш свой зубок, — параіла вавёрка.

— Хто ж арэшкамі зубы лечыць? — здзівіўся зайка.

— Не пярэч, паспрабуй і ўбачыш, што будзе, — настойвала вавёрка.

Узяў зайка адзін арэшак у рот. Шчоўк! Хворы зубок і вываліўся.

— Ну што, баліць зубок? — спытала вавёрка.

— Не! — задаволена ўсклікнуў зайка. — Дзякуй табе, вавёрачка! Зараз я ўжо магу есці арэшкі.

Селі вавёрка і зайка пад ялінкай і пачалі частавацца. Не заўважылі, як паелі ўсе арэшкі. А потым разам пабеглі збіраць новыя, іх шмат у асеннім лесе.

Іра Калошына, Мінская вобласць, Любанскі раён, Шыпілаўская СШ

Пляшачка

У дзедавай вялікай хаце — вялікі склеп. Дзед Анатоль будаваў хату ўжо пасля другой сусветнай вайны, але на месцы, дзе размяшчалася хата, якую ставіў ягоны дзед. Хата дзеда Нупрэя пратрымалася была больш за сто гадоў, хоць невялікая, драўляная. Мела, як усе хаткі, маленькія вокны. Дзед Анатоль, ставіўшы новую, уставіў як найбольшыя вокны, але і так праз дваццаць гадоў змяніў іх на яшчэ большыя. Дом абклаў цэглай, атынкаваў, і дарабіў другое крыло — летнюю кухню. Пад летняй кухняй стаў капаць новы склеп. Праўда, дзед Анатоль больш дапамагаў ды камандаваў — ужо здароўе не тое, а працавалі Адасеў тата Раман ды дзядзька Алесь, а і Адам круціўся. У жоўтым пяску час ад часу трапляліся цікавыя рэчы — а то чарапок нейкі, кавалак жалезіва, а то яшчэ што...

Гэтае цуда — гліняную бутэльку, закаркаваную пакрытай лакам затычкай, дзед Анатоль вынес з падзямелля сам. Ускараскаўся па хісткай драбіне і працягнуў буталь унуку.

— Пакліч Анельку, Адась! Глянь, што я знайшоў! Мабыць, яшчэ майго дзеда ці прадзеда бутэлька.

— А з чым яна ёсць? Пэўна, высахла тое, што там было? Трэба пакаштаваць! — азваўся з долу дзядзька.

— Ну, ты, Алесь, дык усё на смак прабаваў бы! — засмяяўся тата. — Адась, барані Бог, не адкрывай, не прабуй!

Анелька была тут як тут — кінула кніжкі ў кут і паперла на падворак.

— Там джын! — крыкнула з захапленнем.

— Можа і джын, але тым больш не для дзяцей! — дзядзьку Алесю адно было на думцы.

— Дух-джын! — пакрыўдзілася дзяўчынка. — Калі адкаркуем, няхай кожны скажа сваю мару, дык і здзейсніцца.

У гэты момант дзед раскрышыў горла глінянай бутэлькі.

— Каб там джын быў! — не адставаў Алесь.

— Каб мы паехалі ў Егіпет! — дуэт Адась і Анелька быў званчэйшы ад усіх.

— Каб і наша хата стаяла яшчэ сто гадоў! — дзед і тата сказалі разам.

З бутэлькі запахла ні то яловым дымам, ні то цёплым духам, які трываў у ёй шмат гадоў.

Міра Лукша

Фота ЯНКІ ЦЕПУШЭЦКАГА

Хлапчукі-грыбнікі

Пра мастацкія варштаты ў Дубічах

29 верасня 2003 г. самыя лепшыя мастакі дубіцкай школы з настаўнікам Славамірам Кулікам мелі магчымасць удзельнічаць у мастацкіх варштатах, якія наладзіў нам Гмінны асяродак культуры ў Дубічах-Царкоўных.

Мастакі, якія на працягу тыдня пабывалі ў нашай гміне — людзі з Беларусі (5 асоб) і пейзажысты з гайнаўскага раёна — разам з намі размалёўвалі карціны.

Колькі ж было ўражанняў ад такой сустрэчы! Многаму мы даведаліся ад вопытных жывапісцаў, між іншым, як спалучаць і процілпастаўляць фарбы, што кожны малюнак павінен быць глыбока прадуманы творцам, а самае важнае ў кожнай размалёўцы — святло. Малявалі мы з захапленнем пад рупным наглядам прафесіяналаў, якія служылі нам дапамогай і заахвочвалі добрым словам. Аказалася, з гэтай сустрэчы не асталіся толькі запэцканыя пальцы і пафарбаваная вопратка, але нашы сапраўдныя карціны, якія цешаць наша вока, нашай школьнай моладзі і іншых наведвальнікаў выстаўкі.

Анна Герман, Анна Баравік — вучаніцы III класа Гімназіі ў Дубічах-Царкоўных

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Юльяна

Сярод дэкламатараў — індывідуальнасці. Як Юльяна Дораш з бельскай „тройкі". Шасцікласніца выступіла на сцэне Нараўчанскага дома культуры з вершам Кандрата Крапівы „Дзіця, вожык і змяя".

У Юльяны дзіцячы, ласкавы голас. Дзяўчынка ўмее наводзіць „цацачны" настрой, ад якога публіка проста... балдзее.

Юльяна заўсёды падбірае таксама творы, у якіх на першым плане „цацачныя" праблемы герояў.

Дзяўчынка атрымала вылучэнне ў цэнтральным конкурсе „Роднае слова 2003".

Зорка

* * *

Прыйшла восень загарэлая,
прыпечаная на карычнева.
Пасля канікул сюды вярнулася
— гэтак у цёплых краях засмалілася.
Коцік-псоцік выйшаў на двор
І ўбачыў залатых лісцяў прастор.
Не зялёных, каляровых,
А на вугаль спапялёных.

* * *

Прыйшло лета прастуджанае,
бярозавым лістом атуленае.
Кіхае, прыхае,
з носам заткнёным.
Усе дзеці засмучаныя;
летам яны загарэлыя —
гэта салярый зрабіў сваё.

Нарадзіны

Малое зернечка пасаджанае вясной
штодзень паліванае вадой
з часам пускае парастак,
аксамітныя пупышкі ў сонцы развівае.
У страху перад восенню
спрабуе хутчэй даспець,
каб у наступнае лета
захапіць усіх сваёй прыгажосцю.

Юліта Вярбіцкая,
Гімназія ў Нараўцы

Казкі дзяцей Беларусі

Пра чырвоны фламастэр і яго братоў

У адным доме жыў чырвоны фламастэр. У яго было многа братоў. Ён часта з імі спрачаўся, які колер важнейшы. Жоўты гаварыў, што ён важнейшы — ім можна намаляваць сонца. Сіні гаварыў, што ім можна намаляваць мора, неба. Зялёны — траву, лісце на дрэвах. А чырвоны ганарыўся, што ім можна намаляваць агонь. І таму яго ўсе баяліся.

Малявалі яны па адным. Жоўты — сонца, сіні — мора і неба, зялёны — траву ды лістоту, ну а чырвоны — агонь. Аднойчы, калі чырвоны фламастэр намаляваў агонь, сіні падышоў і падумаў: „Калі тут ёсць агонь, то яго трэба заліць вадой. А ваду можна ўзяць з мора", — і намаляваў мора. Падышоў зялёны, убачыў карціну і падумаў:

„Тут ёсць мора, а ў моры павінны быць водарасці", — і намаляваў іх. А яшчэ — зялёную пальму на беразе. Падышоў жоўты, убачыў усё гэта і падумаў: „На гэтай карціне не хапае сонца", — і намаляваў сонца.

Калі ўсе фламастэры вярнуліся, каб узяцца за новыя малюнкі, яны ўбачылі карціну і падумалі: „Які прыгожы пейзаж атрымаўся ў нас! Калі мы будзем маляваць разам, то ў нас будуць выходзіць вельмі прыгожыя карціны". Яны памірыліся і пачалі маляваць разам.

Сярожа Шкалікаў, Віцебская вобласць, Аршанскі раён, Барань

Польска-беларуская крыжаванка № 42

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 38: Ажур, вяз, вінаград, зара, сайт, соя. Віза, Дунай, жарт, жур, ало, радня.

Узнагароду — кніжку „Казкі дзяцей Беларусі" — выйграла **Наталля Сцепанюк** з Беластока. Віншуем!



Каб ГДК быў універсальны

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Размова з Андрэем СКЕПКАМ — дырэктарам Гайнаўскага дома культуры.

— Ужо звыш паўгода працуеце дырэктарам. Што ўдалося зрабіць за гэты перыяд?

— Спачатку трэба было мне пазнаёміцца з новым асяродкам, працаўнікамі дома культуры і наладзіць супрацоўніцтва з гарадскімі ўстановамі, Ваяводскім асяродкам анімацыі культуры ў Беластоку і Беларускім грамадска-культурным таварыствам. У гэтым годзе першы раз наш дом культуры быў галоўным арганізатарам фэсту з удзелам Радыё Беласток. Каб наладзіць мерапрыемства сабралі мы ад спонсараў 17 тысяч злотых. Удалося вярнуць у Гайнаўку арганізаванне павятовых элімінацый Фестывалю беларускай песні. У гэтым годзе ў ГДК былі наладжаны цэнтральныя элімінацыі вучнёўскага конкурсу „Беларуская песня", спалучаныя са святкаваннем міжнароднага дня дзіцяці. Дзякуючы супрацоўніцтву з кіраўніцтвам БГКТ — Янам Сычэўскім і Валянцінай Ласкевіч выступалі ў нас музычныя калектывы з Беларусі. Ва ўсіх 58 мерапрыемствах арганізаваных намі ў першым квартале гэтага года прынялі ўдзел 14 тысяч удзельнікаў. У другім квартале наладзілі мы 38 мерапрыемстваў, у якіх удзельнічала больш за 21 тысячу асоб. Самымі вялікімі мерапрыемствамі ў трэцім квартале былі фэст з Радыё Беласток і фінал Лігі традыцыйнага каратэ. Паспяхова арганізавалася Павятовая спартакіяда прадпрыемстваў і будзем арганізаваць яе ў наступных гадах. Вельмі добра складваецца супрацоўніцтва з Царквою і Касцёлам. Дапамагалі мы арганізаваць Міжнародны фестываль „Дні царкоўнай музыкі". Супольна з праваслаўнымі прыходамі і царкоўнымі арганізацыямі наладзілі агляды калядак і адпачынак для дзяцей. З прадстаўнікамі Каталіцкага касцёла ладзілі мы Дзень дзіцяці.

— Гайнаўскія святары крытыкуюць арганізаванне музычных мерапрыемстваў у час посту, а ў ГДК наладжваеце музычныя сустрэчы ў посныя перыяды. Хаця б вялікае мерапрыемства — фэст з удзелам Радыё Беласток.

— Калі я прыйшоў працаваць у ГДК быў запланаваны фэст з Радыё Беласток. Час не быў добры, бо тады ішло паломніцтва на Святую Гару Грабарку. У наступным годзе паспрабуем наладзіць гэтае мерапрыемства ў пачатку лета. Не будзем арганізаваць музычныя мерапрыемствы ў час посту перад святамі Уваскрэсення Гасподняга і Хрыстовага Раства. Летам прыязджае да нас многа турыстаў і цяжка будзе пазбегчы арганізавання музычных сустрэч у посныя перыяды.

— Што новага ў працы гурткоў?

— Узнавіў сваю дзейнасць фатаграфічны гурток, пачаліся заняткі ў тэатральнай групе. Узнік фальклорны танцавальны калектыў, якім апякуецца Анна Баран. Бадай з'яўляецца ён адзіным калектывам у Падляшскім ваяводстве, які ў свой рэпертуар уключыў беларускія танцы. У час канікулаў часта выступаў ён на беларускіх фэстах. Дзякуючы спонсарам удалося пашыць уборы членам хору ГДК. Новы рэпертуар рыхтуе лялечны тэатр, які, як адзіны ў рэгіёне, выступае з беларускімі прадстаўленнямі. Намагаемся так арганізаваць працу Дома культуры, каб маглі ім карыстацца людзі беларускай, украінскай і польскай нацыянальнасцей. Пакуль буду дырэктарам ГДК буду старацца, каб дом культуры быў універсальным. Буду намагацца, каб у час беларускіх мерапрыемстваў было крыху элементаў польскіх і ўкраінскіх. У час польскамоўных мерапрыемстваў можна будзе паказваць беларускі фальклор.

— У мінулых гадах ГДК быў суарганізатарам Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі. Сёлета памагаў у арганізацыі Міжнароднага фестывалю „Дні царкоўнай музыкі". Як будзе ў наступным годзе?

— Надалей будзем суарганізатарам „Дзён царкоўнай музыкі". Аддамо ў карыстанне нашы залы і гукаўзмацняльную апаратуру.

— Раней былі Вы дырэктарам Гміннага асяродка культуры ў Нараўцы. Чым новая работа розніцца ад папярэдняй?

— Тут асобная культурная ўстанова з бухгалтарам, адміністрацыйнымі працаўнікамі і інструктарамі, якія працуюць з калектывамі. У Нараўцы адказны быў я за культуру, спорт і турызм. Трэба было ўсё асабіста дапільнаваць. У ГДК больш людзей, якія адказваюць за паасобныя мерапрыемствы.

— Што плануеце наладзіць у бліжэйшы час?

— 26 кастрычніка ў Бельску-Падляшскім адбудзецца „Бардаўская восень". Хочам, каб і ў нас выступілі лепшыя выканаўцы гэтага мерапрыемства. Плануем таксама запрасіць да нас калектывы выступаючыя ў час Сустрэч абрадавых калектываў.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей МАРОЗ

Палацы асуджаныя на знішчэнне?

— Што за краіна — адны руіны! — спачувальна заўважыў знаёмы, які аглянуў здымкі з апошняй вандроўкі па Беларусі.

Другая выснова мела дзелавіты характар.

— Такі патэнцыял! З самой турыстыкі можна жыць.

Мова тут пра помнікі мінулага: палацы, касцёлы, цэрквы асуджаныя на знішчэнне. Звычайна такія руіны, пазначаны як помнікі рэспубліканскага значэння і нібыта яны ахоўваюцца дзяржавай. На практыцы пра лёс гістарычнага будынка рашае дырэктар калгаса, якому да лямпачкі меркаванні захавальнікаў фондаў і іх патрабаванні. Калі нават праводзіцца рамонт, выконваюць яго найменшым коштам. Усюды апраўдваюцца нерэнтабельнасцю і безграшоўем.

Праблема не толькі ў адказнасці і безграшоўі. Сучасны беларус, хай і крытычны ў адносінах да савецкага, інстынктыўна ўшануе бальшавіцкія месцы памяці. А вось палац, хай і з эпохі рэнесансу, не прадстаўляе экс-савету каштоўнасці. Гістарычны будынак успрымаецца як звычайны свіран, і ў адрозненне ад апошняга, яго можна бяскарна апаганіць. Як палац у Мураванай, які паводле пісьмовых сведчанняў з'яўляецца навучальнай установай і як помнік архітэктуры ахоўваецца дзяржавай...

* * *

У Малой Бераставіцы (дзесяць кіламетраў у простай лініі ад Крынак) мы адшукалі сямейную магілу Анацэвічаў. Найцікавейшым архітэктурным помнікам у наваколлі лічыцца палацава-паркавы комплекс у Мураванай. Двор знаходзіцца за межамі мястэчка. Шлях да сядзібы значаць дубовыя прысады і сажалкі.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Палац у Мураванай

Ухабістай гравейкай пад'язджаем пад сам дом. Навокал здзічэлы парк і сельскагаспадарчыя будынкі. Ад навучальнай установы няма следу. Карціна палаца выклікае міжвольную прыгнечанасць і бяссілле. Хаця будынак сыплецца „ў вачах", ён незабяспечаны. У сярэдзіне, пасля таго як заваліўся дах, выраслі бярозы і дзікі бэз.

Адзіную пра палац звестку знаходзім у энцыклапедычным выданні „Архітэктура Беларусі":

Мураванская сядзіба, помнік сядзібна-паркавай архітэктуры позняга класіцызму. Створана ў другой палове XIX стагоддзя. У комплекс уваходзяць сядзібны дом, бакавыя флігелі і гаспадарчыя пабудовы. Перад галоўным фасадам сядзібнага дома прамавугольны парадны партэр, да якога вядзе ўязная алея. За домам лесапарк з сістэмай алей і прамавугольнымі сажалкамі і каналамі. Сядзібны дом прамавугольны ў плане 2-павярховы мураваны будынак. Галоўны фасад аздоблены архітэктурным дэкорам і лепкай, цэнтр вылучаецца пілястрамі і франтонам (порцік не збярогся). Прамавугольныя вокны маюць прафіляваныя ліштвы. Планіроўка калідорная з аднамаршавымі лесвіцамі.

* * *

Жыхары Бераставіцы наведваюць дворскі парк, прытым будынак палаца абыходзяць шырокім кругам. Няма чаму здзіўляцца, руіны не ўзбуджаюць рамантычнага палёту, хутчэй наадварот — прыцягваюць вандалаў і ўсякай масці варвараў, каб канчаткова зраўняць з зямлёй. У свядомасці навакольных жыхароў палац запісаўся чорнаю славай, калі тут пасля вайны размясцілася НКВД.

Заняпад будынка наступіў на працягу апошніх гадоў.

Ганна КАНДРАЦЮК

Міхалова

Будзе вадасховішча і амфітэатр

Гмінныя ўлады ў Міхалове Беластоцкага павета намераны пабудаваць у гэтым мястэчку вадасховішча з басейнам для плавання. Будзе яно знаходзіцца пры выездзе з Міхалова ў Заблудаў. Вадасховішча перададуць у карыстанне ў маі 2005 года. Адначасова пачнуць пабудову амфітэатра і трыбуны ды спартыўных пляцовак. Дагэтуль, калі ладзілі фэст або вялікі канцэрт, турнір гмін або іншае масавае мерапрыемства, дык будавалі часовую сцэну ды прывозілі і адвозілі крэслы.

Пабудова пачнецца вясною 2004 года. Рада Міхалоўскай гміны адобрыла план згаданых інвестыцый. Дагэтуль выкупілі ўжо патрэбную тэрыторыю, распрацавалі праект. (яц)

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Новая агароджа вакол сабора

З жыццёвым крыжам

У час свята Уздзвіжання Крыжа Гасподняга Літургію ў Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы ўзначальваў епіскап Гайнаўскі Міран. На богаслужэнні вернікі прыкладаліся да часціцы Крыжа Гасподняга, на якім быў распяты Хрыстос. Знаходзіцца яна ў Святым Крыжы, што выносіўся з алтара на сярэдзіну царквы.

Яшчэ ў час усяночнага богаслужэння епіскап Міран у саслужэнні святароў вынеслі Крыж з алтара. Перад палажэннем на аналой епіскап апускаў яго чатыры разы да падлогі і пасля падымаў, блаславляючы вернікаў. Хор у пакутным тоне спяваў „Госпадзі памілуй", чарговы раз пераказваючы падзеі з IV стагоддзя. У час пропаведзі ўладыка Міран адклікаўся да гістарычных здарэнняў, у час якіх па загаду царыцы Алены быў выкапаны Крыж Гасподні. Разам з ім знойдзены былі два іншыя крыжы, на якіх распятыя былі разбойнікі. Каб спраўдзіць аўтэнтычнасць Святога Крыжа, на якім распяты быў Хрыстос, прылажылі да яго памерлага чалавека і той ажыў.

Епіскап Міран заклікаў шанаваць і аднаўляць прыдарожныя крыжы, якія нішчэюць каля пусцеючых вёсак. Уладыка заклікаў вернікаў пакінуць грахоўнае жыццё. Гаварыў, што мы пастаянна сваімі грахамі распінаем Хрыста і таму павінны пазбягаць дрэнных паводзін. Тыя, якія наракаюць на хваробы і сямейныя няшчасці, павінны аддаць свой лёс у рукі Госпада і маліцца да Яго. Усе жыццёвыя цяжкасці з'яўляюцца крыжам, які з падзякай Богу павінны несці людзі.

Пасля галоўнага святкавання на працягу тыдня служыліся перад Крыжам акафісты. Кожны дзень прыходзілі парафіяне на малітвы, пакланяліся перад святасцю і прыкладаліся да яе. Зараз вакол Свята-Троіцкага сабора многа крыжоў і ўстанаўліваюцца новыя, на будаванай мураванай агароджы.

Аляксей Мароз

Экуменічны апякун Белавежскай пушчы

Фота МІКОЛЫ ВАЎРАНЮКА

Ля каплічкі св. Яўстафія а. палкоўнік Міхал Дудзіч з Палявога ардынарыята Польскага Войска

Адзіная ў Польшчы капліца першага хрысціянскага апекуна лесніко ў і паляўнічых — святога Яўстафія — знаходзіцца ў Белавежскай пушчы, на тэрыторыі Надляснічтва Броўск. У сухім дубе выразаны барэльеф святога і аленя з крыжом між рагамі.

Святы Яўстафій жыў на зломе першага і другога стагоддзяў нашай эры. Зваўся Плакід і быў камандзірам рымскіх легіёнаў пры кесары Траяне. Аднойчы з'явіўся яму алень з крыжам і паказаў дарогу да новай веры. Плакід прыняў хрысціянства, за што быў замучаны разам з сям'ёю. Пасля пакутніцкай смерці быў прызнаны святым і заступнікам людзей звязаных з лесам. Толькі ў XIV стагоддзі ў заходняй Царкве распаўсюдзіўся культ нямецкага біскупа Губерта, які жыў у VIII стагоддзі і заслужыўся ў змаганні з шаленствам. Пры чым, новы святы пераняў атрыбутыку старога, а аленя, які намовіў Плакіда прыняць хрысціянства, сталі зваць аленем святога Губерта.

Чаму леснікі з Белавежскай пушчы пастанавілі вярнуць памяць святога Яўстафія?

— Таму, што быў ён святым задоўга да падзелу Царквы на ўсходнюю і заходнюю, — тлумачыць Вальдэмар Сярадскі, надляснічы Броўска. — Прызнаюць яго як каталікі, так і праваслаўныя, што вельмі важнае на нашай змешанай нацыянальна і рэлігійна тэрыторыі. Лясную каплічку св. Яўстафія стварылі мы з верай, што будзе ён заступнікам усіх людзей, якія сваімі каранямі, прафесіяй і эмоцыямі звязаны з Белавежскай пушчай.

У дзень смерці св. Яўстафія — 20 верасня — у Надляснічтве Броўск спаткаліся леснікі з Белавежскай пушчы. Спаборнічалі яны ў паляванні на віртуальнага зубра, стварылі Раду старэйшын Белавежскай пушчы, папоўнілі рады паляўнічых новымі сябрамі, маліліся ля каплічкі, а наканец частаваліся стравай і песняй ля вогнішча. Гэтыя сустрэчы — „Плакідыі" — будуць цыклічнымі.

— Не скрываю, што разлічваем да дапамогу св. Яўстафія яшчэ ў адным, — кажа з усмешкай надляснічы Вальдэмар Сярадскі, — зацікаўленню Белавежскай пушчай як найбольшай колькасці людзей. Да каплічкі ўжо едуць экскурсіі. Думаю, што і „Плакідыі" з часам будуць турыстычным атракцыёнам. Чым больш людзей будзе пазнаваць пушчу, спатыкацца з леснікамі, тым лягчэй будзе захаваць гэты неацэнны скарб будучым пакаленням.

М. В.

На месцы Аршанскай бітвы

У сярэдзіне траўня бягучага года я пабываў на месцы падзей знакамітай Крапівенскай бітвы 1514 года (пад Оршай). Уражанняў атрымаў шмат. Яшчэ перад паездкай я ведаў, што трэба добра запамятаць арыенціры гэтае мясцовасці, бо прыехаўшы прыйдзецца доўга блукаць. Але блукаць мне прыйшлося з іншае нагоды.

Яшчэ хачу патлумачыцца, чаму гэты матэрыял адрасую польскім аматарам гісторыі. Па-першае: загадчык аршанскага Музея гісторыі і культуры Віктар Лутынскі пазнаёміў мяне з польскай кнігай Пятра Дружджа „Orsza 1514". Па-другое: у бітве ўдзельнічала каля 3,5 тысячы вояў з Вялікапольшчы і за 17 тысяч вояў з Малапольшчы. І адным са складнікаў маіх пошукаў былі г.зв. „польскія могілкі".

У першым томе „Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" змешчана схема бітвы; па ёй падзеі 1514 года адбываліся ў трохкутніку вёсак Пашына — Пугайлава — Рукліна. Месцазнаходжанне вёскі Пашына жыхары Оршы мне падказалі адразу — гэта недалёка ад самога горада. А вось дзве астатнія мяне насцярожылі; ужо не падлічыць, колькі людзей я апытаў па дарозе ў Пашына і колькі часу патраціў у самой вёсцы размаўляючы са старымі яе жыхарамі: ніхто не ведае ні пра Пугайлава, ні пра Рукліна. Толькі дзве бабулі ў Пашына ўпэўнена сказалі, што адна з цікавячых мяне вёсак гэта Шугайлава, а Рукліна яшчэ праз нейкі час аставалася цёмнай загадкай.

Пакуль я выбраўся з Пашына ў Шугайлава прайшла далёка не адна гадзіна. Тут мне пашанцавала, але далёка не адразу: чым болей пытаешся, тым болей знаходзіш. І высветлілася, што калісьці паміж вёскамі Шугайлава і Ларынаўка была невялікая вёсачка Рукля. Калі ў гэтай мясцовасці ў самым канцы 30-х гадоў XX стагоддзя пачалася калектывізацыя, усе яе хаткі былі сселены ў найбліжэйшую вёску Ларынаўку. Значыць, сёння той трохкутнік падзей 1514 года, вызначаюць вёскі Пашына, Шугайлава і Ларынаўка, але шматлікія навукоўцы капіруюць схему падзей 1514 года з нейкай крыніцы, ні разу не пабываўшы на месцы.

Тры дні я блукаў па месцы падзей, хапіла б і на чацвёрты, але ў кожнага свае абмежаванні часу. Калі паспрабаваць аднавіць ход падзей, трохкутнік Пашына — Шугайлава — Ларынаўка быў даволі вялікай адкрытай прасторай, якую вялікай дугой ахоплівае Дняпро; тут, насамрэч, маглі распачацца баявыя дзеянні. Калі гетман Канстанцін Астрожскі з'імітаваў адступленне, ён павёў свае войскі да вусця Крапівенкі; прыціснуць тут непрыяцеля цалкам магчыма...

Я вельмі схематычна намаляваў месцазнаходжанні „помнікаў" паўтысячагадовай даўнасці. Размяшчаюцца яны пабапал ракі Крапівенка, якая „рассякае" напалову дарогу з Оршы ў Дуброўна. У гонар бітвы на правым беразе Крапівенкі, пад вёску Гацькоўшчына, дзе раней былі кар'еры, стаіць вялікі камень і, зводдаль, крыж. На левым беразе Крапівенкі, каля 150 метраў ад яе левага берага і 60 метраў ад Дняпра, каля дзесяці гадоў таму быў курган дыяметрам 6-7 метраў і вышынёй 1,5 метра. Зараз, калі меркаваць па слядах, на гэтым месцы стаіць металічная будка ад аўтамашыны; гэта нечый участак. Побач левага берага Дняпра, 350-500 метраў уніз ад Крапівенкі, „польскія могілкі". Археолагі капалі „ў трохкутніку", але нічога цікавага там не знайшлі. Могілкі перакапалі цікаўныя, што пасвядчаюць мясцовыя жыхары. Ад Крапівенкі да вёскі Сяглава і далей — сучасныя дачы і лецішчы, якім ужо за дваццаць гадоў. Першыя дачнікі пра могілкі не ведаюць (не хочуць ведаць, „няхай не брэшуць", як сказалі мне ў вёсцы Сяглава). Мой шпацыр уздоўж берага Дняпра нічога не даў, адно некаторыя дачнікі сталі касавурыцца на мяне. Добра, што час ставіць усё на сваё месца і пэўная частка людзей кідае свае дачы, пабудаваныя, дарэчы, на людскіх касцях.

Пятро Амбрасовіч, Санкт-Пецярбург

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Паўлаўскі палац

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Кацярынінскі палац (від ад парку)

У Расіі

У бурштынавым кабінеце

У нядзелю рашыліся мы паехаць у Царскае Сяло, аддаленае ад Пецярбурга на некалькі дзесяткаў кіламетраў. Да акраін горада даехалі мы на метро, а пасля пераселіся на пасажырскі чыгуначны транспарт. Раніцай пасажыраў не было многа, былі свабодныя месцы. Калі рашыліся мы спытаць пра наш прыпынак аказалася, што Царскае Сяло ўжо за намі.

Выйшлі мы ў Паўлаўску, дзе наведалі рамантаваную царкву са старымі і новапісанымі іконамі. Побач храма раскінуліся руіны невядомай будоўлі. На Літургію прыйшла невялікая колькасць вернікаў, старэйшых асоб і моладзі. Богаслужэнне доўжылася гадзінамі і некаторыя вернікі выходзілі з царквы ў ходзе службы. Пасля наведалі мы Паўлаўскі палац і велізарны парк побач палацовага комплексу. Турысты шпацыравалі па парку і каталіся на фурманках. Каля касы выстраілася чарга ахвотных увайсці ўсярэдзіну часткова адрамантаванага палаца. Палацова-паркавы комплекс збудаваны быў у канцы XVIII стагоддзя. У лік самых прыгожых залаў можна ўключыць італьянскі і грэчаскі пакоі, карцінную галерэю і бібліятэчны пакой. Асабліва вылучаецца спальня. Многа ў ёй золата, разьбы і каляровых малюнкаў. Сцены прыкрыты ядвабным пано з паліхромнай роспіссю. Турыстаў захапляюць вялікія калідоры і залы са шматлікімі аздобамі. Граніт, мармур, разьба і пазалочаныя элементы састаўляюць прыгожыя кампазіцыі. Паўлаўскі парк (600 гектараў) быў самай вялікай царскай загараднай рэзідэнцыяй.

У Царскае Сяло, якое саветы перайменавалі на Пушкіна (вучыўся тут А. С. Пушкін) пераехалі мы на машыне. Рамантаваліся ў ім толькі некаторыя палацы. Астатнія і праваслаўныя цэрквы перамяніліся ўжо ў руіны. Некаторыя храмы былі здадзены ў публічнае карыстанне з насмешкай над святынямі. Многія турысты стараюцца трапіць у Екацярынінскі палац, дзе знаходзіцца бурштынавага кабінета.

Царскае Сяло — комплекс палацаў, цэркваў, павільёнаў і трыумфальных помнікаў XVIII-XIX стагоддзяў. Было яно любімай рэзідэнцыяй Кацярыны I, Кацярыны II Вялікай, Аляксандра I і Мікалая II. Кацярынінскі палац пачалі будаваць у 1708 годзе як рэзідэнцыю для жонкі Пятра I Кацярыны Аляксееўны. Пасля пачалі разбудоўваць яго ў барочным стылі. Самымі цікавымі з'яўляюцца янтарны кабінет, парадная і карцінная залы. Абсталяванне янтарнага кабінета атрымаў Пётр I у 1716 годзе ад прускага караля Фрыдрыха Вільгельма I. Да канца свайго жыцця цар не распакаваў скрыняў з янтарнымі аздобамі. Не зрабілі гэтага царыца Кацярына і яе сын Пётр II. Толькі царыца Елізавета рашылася ўстанавіць бурштыны ў Зімовым палацы, якія ў 1755 годзе перанесены былі ў Царскае Сяло. У кабінеце было, між іншым, 12 вялікіх янтарных мазаік памерамі 3,7 метра на 1,4-1,9 метра, размешчаных на дубовых плітах. Восенню 1941 года немцы сарвалі са сцен бурштынавае абсталяванне і вывезлі ў Кёнігсберг (сённяшні Калінінград). На сценах засталіся толькі фрагменты янтарных аздобаў. Пасляваенныя пошукі бурштынавага кабінета не далі станоўчых вынікаў і ў 1979 годзе ўрад Савецкага Саюза прыняў рашэнне адбудаваць помнік на падставе дакументацыі і застаўшыхся дэталяў. Аднаўленне кабінета працягвалася 24 гады і каштавала 11,5 мільёна долараў (у XVIII стагоддзі спецыялісты працавалі 11 гадоў). Яе адкрыццё адбылося ў маі 2003 года і было прымеркаванае да святкаванняў 300-годдзя Пецярбурга. Цудоўныя бурштынавыя сцены разам з фларэнцкай мазаікай састаўляюць вельмі прыгожую кампазіцыю.

Турыстаў у Кацярынінскім палацы захапляе адпачывальня з тонкімі калонкамі і каляровымі аздобамі ды сіняя гасцінная з ядвабнымі сценамі, рознакаляровым паркетам і прыгожа распісанай столлю. У Кацярынінскім парку побач рэгулярна пасаджаных дрэў прыцягваюць увагу мармуровая скульптура, барочныя павільёны для адпачынку і прыгожы фантан „Малочніца" (дзяўчынка са збанком).

Аляксей Мароз

Лавіў вецер у полі

За вёскай Хмялеўшчына, што ў Шудзялаўскай гміне, стаіць колішні вятрак. Летам яго здалёк не відаць, бо закрыты дрэвамі, затое бязлістнаю зімою ён лепш відны. Вятрак гэты з'яўляецца ўласнасцю сям'і Пракопчыкў з Хмялеўшчыны, якія ў 1924 годзе купілі яго недзе за Саколкай і перавезлі на сваё поле. Гэты ветравы млын, у якім працаваў уласнік і наёмны млынар, малоў збожжа навакольным земляробам да 1935 года, пакуль вецер не паламаў аднаго крыла. Праз нейкі час крыло адрамантавалі, але скора вятрак пацярпеў чарговае крушэнне, гэтым разам не ад прыроднай стыхіі, але ад рэвалюцыйнага запалу...

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Вонкавы від ветрака

Калі ў 1939 годзе прыйшлі сюды саветы, яны ў рамках раскулачвання ўласнікаў пабілі крылы ветрака. Неўзабаве саветаў замянілі немцы, якія ў сваю чаргу забралі млынавыя камяні для вадзянога млына ў не надта адлеглую Вайцяхоўшчыну, якая пасля вайны апынулася за дзяржаўнай мяжою.

Сям'я ўласнікаў млына, якая ў выніку ваенных і сацыяльных падзей скацілася з кулакоў у беднякі, не змагла ўжо адбудаваць спустошанага ветрака. Пракопчыкі хацелі вятрак прадаць, але нехта з Беластока засцярог, што гэта помнік даўніны. І цяпер уласнікі ў клопаце: ні разабраць, ні прадаць ветрака не могуць, а для яго рамонту няма ў іх грошай.

А вятрак гэты сапраўды варты беражлівай увагі. Гэта канструкцыя галандскага тыпу, у якой быў паваротлівы купал; сёння таго адмысловага купала ўжо няма. Але асталося ўсё апошняе з аграмаднага механізму, які чыстую энергію прыроднай стыхіі выкарыстоўваў для працы чалавеку, не вытвараючы пры гэтым ніякіх шкодных адкідаў. Яшчэ захаваліся велізарныя драўляныя зубчаткі, якія агромную сілу, атрыманую ад ветру, пераносілі на сабе млынавым камяням. Уражваюць не толькі згаданыя зубчаткі і восі, з якімі яны круціліся, але і сама вонкавая аддзелка збудавання. Сцены ветрака абабіты гонтамі, якія з ходам гадоў сталі своеасаблівым творам мастацтва, якога сааўтарамі чалавек і спрэжаны з прыродай час.

З тых пор, калі ставіўся вятрак у Хмялеўшчыне, мінае восемдзесят гадоў. За той час чалавек выцягнуў з зямлі, быццам са скрыні Пандоры, новыя віды прыроднай стыхіі. Цяпер вецер разносіць па зямлі цэзій, стронцый, уран... Чалавеку ад гэтага стала жыць лягчэй, з'явілася ў яго багата вольнага часу, які бестурботна можна распускаць на дуй-вецер.

Аляксандр Вярбіцкі

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Дэталі ветравой машыны на фоне неба

Аб школах, злачыннасці і сацыяльнай дапамозе

У час VIII сесіі Рады Гайнаўскага павета, якая адбылася ў канцы жніўня, разглядаліся пытанні адукацыі, аховы парадку і сацыяльнай дапамогі ў павеце. Паводле даных, прадстаўленых кіраўніком Аддзялення грамадскіх спраў Уладзімірам Петручуком, у першыя класы сярэдніх школ Гайнаўскага павета паступіла каля шасцісот асоб. Амаль палову складаюць вучні Комплексу прафесійных школ у Гайнаўцы. Амаль усе вучні гэтай школы выбралі ліцэі (толькі каля трыццаці асоб будзе вучыцца ў адзіным прафесійным класе). Нават тыя асобы, якім з вялікімі цяжкасцямі ўдалося закончыць гімназію, рашыліся стаць ліцэістамі або вучнямі тэхнікумаў. З ліку астатніх вучняў найбольш рашылася вучыцца ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы. У школу прынялі больш белліцэістаў, чым раней планавалі. Усе апошнія пайшлі вучыцца ў Комплекс агульнаадукацыйных школ у Гайнаўцы і Комплекс лясных школ у Белавежы. Кожны пяты першакласнік Гайнаўскага павета будзе вучыцца беларускай мове ў белліцэі.

Радныя прынялі Павятовую праграму прадухільвання злачынстваў, аховы бяспекі грамадзян і публічнага парадку. У мінулым годзе зарэгістраваных было 335 крадзяжоў з разбоем, 208 — крадзяжоў чужой маёмасці, 6 — крадзяжоў машын 19 — боек і адно забойства. Паводле спецыялістаў, гэты вынік — добры. Аднак ён занепакоіў радных і, напэўна, ахвяр злачынстваў. У новай праграме асаблівая ўвага адведзена захаванню публічнага парадку і дзеянням дзеля абмежавання росту злачыннасці сярод непаўналетніх. Гэтаму маюць садзейнічаць супрацоўніцтва паліцэйскіх з грамадзянамі і дадатковыя заняткі для моладзі ў школах і па-за ёю. За ажыццяўленне праграмы адказнымі, побач паліцэйскіх, будуць Гайнаўскае староства, школы і адпаведныя павятовыя ўстановы.

Радныя прынялі інфармацыю аб дзейнасці Дома сацыяльнай дапамогі ў Белавежы, у якім жыве больш за 70 асоб і Дзіцячага дома ў Белавежы (55 месц). Сацыяльнай дапамогай у Гайнаўскім павеце займаюцца таксама Дом самадапамогі, Дом міласэрнасці „Самаранін" і Праваслаўны асяродак міласэрнасці Варшаўска-Бельскай епархіі.

Аляксей Мароз

Неабходнае абучэнне

На чыгуначнай лініі Беласток — Чаромха і Чаромха — Беласток курсіруе цягнік з вагонам першага класа. З Беластока ад'язджае ў 15^{25}, а вяртаецца з Чаромхі наступнай раніцай у 4^{00}. Чыгуначнікі гавораць, што вагон пастаўлены па жаданні працаўнікоў Прадпрыемства чыгуначнага рухомага саставу, якія даязджаюць штодзень на працу (каб можна было паспаць на мяккіх крэслах). Не было б нічога дзіўнага ў гэтым, каб не адно „але". Паводле закону (дадатак службовы да раскладу язды) гаворыцца, што ва ўспамянутых цягніках знаходзяцца адно вагоны другога класа, значыцца вагон „едынкі" лічыцца такім жа як і іншыя, і карыстацца ім можа кожны падарожны. Рэчаіснасць падказвае іншае. Абслуга цягнікоў неаднойчы патрабуе ў час праверкі білетаў пераходу пасажыраў у „другі" клас. Паступае, зразумела, незаконна. Калі мая дачка збіралася на вёску 26 верасня г.г., дык я патлумачыў ёй, што павінна адмовіць кандуктару, калі патрабуе пераходу ў другі вагон. Так і было. Дзяўчына адказала, што ў гэтым цягніку няма вагонаў першага класа і спаслалася на дырэктара. Кіраўнічка цягніка збянтэжана адказала: „Калі так, прабачце: я не ведала". Няўжо яно так?! Кіраўнік поезда некампетэнтны на службе? Дык неабходна абучыць такіх работнікаў і павучыць, як павінны ставіцца да падарожных. (ус)

У Гушчэвіне

Самі сабе

Аказваецца, грамадскія пачыны яшчэ не перажыліся. У вёсцы Гушчэвіна Нараўчанскай гміны ў мінулым годзе адрамантавалі ў такім пачыне гравейку ў Грушкі. Пры рамонце займалася 15 чалавек. Войт забяспечыў ім землечарпалку. Жвір вазілі 10 трактарамі. Пасля зрабілі насып і выраўнялі маставую на ўсёй яе даўжыні.

Сёлета солтыс Анатоль Раманчук зноў заініцыяваў грамадскі пачын. У гэты раз узяліся за рамонт мясцовай святліцы. Гміна дапамагла фінансамі: купілі цэглу, бляху і фарбу. Новы комін на будынку пабудаваў Вячаслаў Ігнацюк са Старога Ляўкова і не ўзяў за гэта ні граша. Святліцу рамантавалі Міраслаў Раманчук, Славамір Раманчук, Марыя Раманчук, Андрэй Аўласюк, Антон Леўша, Мікалай Сачко, Тамара Зубрыцкая, Мікалай Насута, Ян Насута, Валянціна Насута, Ірэна Бароўская, Ян Скепка і Антон Андрушко.

У наступным годзе святліцу разбудуюць. Будзе ў ёй кухня. Гурток вясковых гаспадынь мае многа кухоннай пасуды, талерак, лыжак, відэльцаў, шклянак і г.д. У святліцы будуць ладзіць вяселлі, хрэсьбіны і імяніны, будуць адбывацца кампанейскія сустрэчы, супольныя вячоркі ў асенне-зімовы перыяд.

(яц)

Сацы каля Трасцянкі

Карункавая вёска

Вы хочаце прыгажосці? Не раю шукаць далёка. Накіруйце свае крокі туды, дзе сярод пагоркаў і ўзлескаў над струменем-ручаём прысела вёска Сацы, што на Гайнаўшчыне. Прайдзіцеся па яе вуліцы, паглядзіце на хаты. Шматлікія з іх атулены вуалем разьбы. Хаты ў карунках, як у шалях. Разумееце? У драўляных карунках.

Па ўсім відаць, што кожны гаспадар стараўся, каб была ў яго хаты іншая прыгажосць, ішны ўзор, чым у суседа. А каб узор па дрэве скласці, для гэтага асаблівы талент патрэбны.

Наведайце карункавую вёску Сацы (яна ў трох кіламетрах ад Трасцянкі), і вы ўбачыце красу народнага мастацтва. Тут мудрагелістыя ўзоры красуюць вакол вокан, на вуглах, ганку ды шчыце, прыдаючы будынку стройнасці і лёгкасці.

Янка Целушэцкі

Фота Янкі Целушэцкага

З месячнага боку

Дарагая Домна! Хачу табе расказаць свой сон. Снілася мне, як я са сваімі калегамі (сярод іх быў мой аднакурснік, з аднае групы, цяпер вядомы журналіст) караскаемся па нейкіх усходах. Раптам бачым, што звісаем на руках пад нейкім падстрэшкам, а пад намі — пустэча. Трымаемся, бо ніяк не выпадае пусціцца (маю ўражанне, што хтосьці да нас прыглядаецца), але і няма як вярнуцца на зямлю.

У другім сне мой сябра (не той з першага сну) дзесьці прападае, а прыходзіць нейкая жанчына, стройная, хоць пухленькая; маю ўражанне, што яна ведае, дзе ён знаходзіцца, але прыйшла спецыяльна, каб з мяне кпіць і знерваваць. Не магу ад яе ўцячы. Увесь час мне здаецца, што хтосьці мяне хоча пакрыўдзіць, учыніць мне прыкрасць.

Марына

Праўда, пазітыўна мяняецца тваё становішча, у цябе, аднак, шмат з гэтым боязі. Развіваешся, што відаць з твайго ўваходжання ўверх. Звычайна, гэта пазітыўны знак. У псіхічным развіцці чалавека гэта значыць таксама, што ўздымаешся на вышэйшы ўзровень свядомасці, робішся „больш асвечаная", жывеш больш свядома. Але, як вядома, не толькі з літаратуры, веды нясуць з сабой пэўную рызыку.

У тваім сне відаць, што ты чым больш свядомая сябе і свету, тым больш у табе боязі, недаверу. Не ведаю, ці канкрэтна гэта датычыць твайго калегі ці проста таму, што чым больш жыццёвых досведаў, тым больш у чалавеку недаверу. Ты — у калектыве асоб, але таксама пад чыімсьці назіраннем. Знізу пустэча, але не выпадае зысці ніжэй. Такая сітуацыя — як пастка, з якой цяжка знайсці выхад. Словам — ад набытай веды аб сабе, значыць, самасвядомасці, няма вяртання.

Вяртаючыся да твайго сябра, гэты сон датычыць таксама яго. Сама будзеш ведаць, у чым справа. Можа быць, здарылася штосьці такое, што падсвядома прадчуваеш, што траціш да яго давер? Або, з другога боку, вельмі за яго баішся. Тое становішча — мабыць, бландзінка, якая паяўляецца замест яго. І невядома, ці яна яго выкрала, ці, можа, яна яго каханка? Гэта вельмі цяжкая для ацэнкі сітуацыя. Можа, табе цяжка акрэсліць свае ўласныя пачуцці ў адносінах да твайго сябра і перакладваецца гэта на такія сонныя карціны.

Домна

Міхалоўская гміна

Рамантуюць і будуюць

Сёлета ў Міхалоўскай гміне адрамантавалі 16 кіламетраў дарог. У канцы верасня закончылі аднаўленне дарогі ў вёску Пянькі. У самым Міхалове паклалі асфальт і тратуары на двух кіламетрах вуліц.

У верасні ў Міхалове перадалі ў карыстанне новую ачышчальню сцёкаў. На тэрыторыі гміны пабудавалі 10 кіламетраў водаправодаў. Побач гімнастычнай залы Пачатковай школы ў Міхалове пабудавалі спортпляцоўку для шматлікіх відаў спорту, у тым ліку бегавую дарожку, месцы для скокаў, кідання кап'я і штурхання ядра, пляцоўку для гандбола.

Гміна адрамантавала клуб у Тапалянах ды дэпо ў Бандарах, пабудавала мола на Семяноўскім вадасховішчы. Агулам сёлета выдала на інвестыцыі 5,2 млн злотых. (яц)

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2004 r. upływa 5 grudnia 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Як гэты ўспамін грыбной восені найлепш падпісаць? Дашліце свае прапановы па электроннай ці звычайнай пошце — апублікуем...

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

— Што павінен ведаць студэнт?

— Студэнт павінен ведаць усё.

— Што павінен ведаць магістр?

— Магістр павінен ведаць усё па сваёй галіне.

— Што павінен ведаць доктар?

— Доктар павінен ведаць усё па сваёй спецыяльнасці.

— Што павінен ведаць доктар габілітаваны?

— Доктар габілітаваны павінен ведаць, у якой кніжцы што напісана.

— Што павінен ведаць дацэнт?

— Дацэнт павінен ведаць, дзе знаходзіцца бібліятэка.

— Што павінен ведаць прафесар?

— Прафесар павінен ведаць, дзе дацэнты.

* * *

Прафесар медыцыны завёў студэнтаў у шпітальны пакой:

— Лекару, — кажа, — трэба быць кемлівым і нельга яму брыдзіцца хворымі.

Сказаўшы гэта прафесар прыткнуў палец да гніючай раны хворага і зараз яго аблізаў. Гледзячы гэта некалькі студэнтак самлела, аднак прафесар не збянтэжыўся гэтым і спытаў:

— Ці хтосьці з вас спрабуе зрабіць тое што і я?

Выступіў адзін студэнт, прыклаў палец да гніючай раны, аблізаў і па хвіліне званітаваў.

— Хворым вы не брыдзіцеся, — ацаніў прафесар, — аднак вы някемлівы. Вось я прылажыў адзін палец, а аблізаў другі!

* * *

У адзежнай краме прывабная дзяўчына звяртаецца да прадаўшчыцы, каб тая дапамагла ёй выбраць купальны касцюм.

— Ці гэта мае быць касцюм для адпачынку, — пытае прадаўшчыца, — ці марыцца вам летняя прыгода?

* * *

На вуліцы сустракаюцца два колішнія сябры-студэнты.

— Што ў цябе? — пытае адзін.

— Ажаніўся.

— І не наракаеш?

— Не наракаю.

— А чаму ў цябе падбітае вока?

— А-а-а, гэта, калі наракаю...

* * *

У кавярні:

— Я сёння саламяная ўдавіца, — інфармуе яна.

— Магчыма, — абыякава адказвае ён, — але я не з'яўляюся вегетарыянцам.

Адгаданка

1. рэзкі гук, які ўтвараецца пры дапамозе свісцёлкі, 2. від пісьмовай работы для праверкі, напр., арфаграфіі, 3. саматканая паласатая спадніца, 4. ніжняя частка абутку пад ступнёй, 5. напр. кастапраў. (Ш)

Рашэнне адгаданкі атрымаецца, сходзячы па „ступеньках" зверху ўніз. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 35 нумара

Рэйка, таўкач, Рым, меч, луг, дуга, шуляк.



Рашэнне: **Маеш дачку — трымай гарэлку ў глячку.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Лук'янюку** з Бялкоў і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

З дапаможным сродкам

Што рабіць, каб доўга жыць — тлумачыў усім у сваім вершы калісьці Дзядзька Квас. Не кажу, каб ужо надта ж доўга, але каб хоць добра.

— Няма чаго наракаць. Каб не было горш, — выказаў думку ўсіх тыповых беларусаў Коля Здунюк. — Вось, толькі што памёр адзін дзядзька ў Японіі, пражыўшы 114 гадоў. Думаеш, у той Японіі лёгка?

— Жоўтая раса дык пад старасць зусім лёгкая робіцца. Бы засушаныя скуркі ад лімонаў. Такі дзядуля, мабыць, засох на экспанат... — са спачуваннем паляпаўся па сваім жывоціку Збышка Наскварка. — Я цяпер, вось, п'ю *Бодымакс*, дык энергія мяне проста выпучвае. Мая Тамарка ў жаху! Стараецца, ды не прымае ніякіх дадатковых вітамінаў, і не спраўляецца з маімі патрэбамі. Пайшоў я да знаёмай трэнеркі фітнеса, а яна не хоча на гэту тэму са мной размаўляць, кажа, застары ты, Зібі, для мяне.

— Ну, без гэтак званай перасады! Ужо ж ты не выдумляй! — Коля ўявіў, як разахвочаны Збышка прапануе маладзіцы свае паслугі. — Та ўжо ж, захацела б такога паненка!

— Збышка курп, але найлепшыя наконт гэтага — людзі ўсходу. Ну, у сэнсе, скажам, беларусы. Гляньце, хлопцы, на таго Паўла Парняка, якому 113 гадоў і 7 месяцаў. Жыве ад гадоў з унукам у горнай вёсцы. Усё жыццё цяжка рабіў на зямлі, а паходзіць ён, як кажуць, з Усходніх крэсаў. Наш чалавек. Адчувае, хлопцы, ён сябе досыць добра. На жаль, бачыць усё горш і не можа аглядаць свайго ўлюбёнага тэлебачання. Нядаўна трапіў у бальніцу з гарачкай, але сам ён — прыклад выдатнага здароўя. Гэтак кажа пра дзеда 56-гадовы ягоны ўнук Браніслаў Любэцкі, — пахваліўся я ведамі з Інтэрнэту.

— А спіць добра? — папытаўся Збышка, які ў апошні час не можа заплюшчыць вачэй, бо калі засне, цэлымі начамі ганяецца за бабамі.

— Хапае яму 4 гадзіны сну. Шмат адпачывае. У ложку ляжыць да 15 гадзіны. Пасля ўстае, снедае...

— І я так хацеў бы... — пачухаўся Коля па патыліцы. — А якая дыета ў яго? Дзядзька Квас прапанаваў, каб паесці добра, але не зашмат.

— Есці ўсё, што і хатнія. Каб паправіць настрой, бярэ чарачку чагосьці мацнейшага. Ды з алкаголем не перабольшвае. Цыгарэт не смаліў. Любіць пашпацыраваць з унукам па агародзе, па вёсцы. А найбольшы кайф для яго — выкупацца ў гарачай вадзе з пенай. І спяваць любіць дзядуля... Дачакаўся 11 унукаў, 28 праўнукаў і 20 прапраўнукаў... — чытаў я хлопцам, і настрой мой падаў. — А ў мяне ўнукаў няма...

— То і клопату менш... Дарэчы, мог бы ты пастарацца, — звярнуў мне ўвагу Збышка.

— А скуль унукі бяруцца? Хіба ж буслы іх не прыносяць, — я стараўся быць дасціпны. — Ці ў капусце, скажыце, знайсці можна сабе ўнука?

— Адна бабуля з'ела гарошынку, і нарадзілася ў яе Пакацігарошак. Гэта ў казцы было, — рабіліся мы ўжо, за Колем, выразна здзяцінелыя.

Тут празвінеў Збышкаў мабільны тэлефон.

— Та-а-ак. Слухае вас Наскварка, — Збышкаў голас гучаў усё больш упэўнена. — Та-ак, у мяне ёсць, мабыць, час недзе ў 17.35. Добра, у Эм... І я цябе таксама.

Гэта быў званок ад трэнеркі фітнеса! Клюнула!

Вандал Арлянскі

Невыносны свіргат

— Час брацца за перапёлак. Лётаюць такія, вось, ды свіргочуць, што ім у дурны птушыны мозг заляціць, — пачаў чарговы сход уселяснога кіраўніцтва мядзведзь Сандар Жоржавіч. — Трэба абмежаваць дзейнасць гэтых палятух. Могуць, вядома, дзе належна, лётаць, ды нельга дазволіць ім на такое гучнае ды паклёпніцкае свіргатанне.

— Ага, ага, гэты свіргат проста невыносны, — падтакнула лань Гаўрусіха. — Перабягаючы лясныя паляны, услухоўваюся ў цішу, а тут, раптам, разумееце, нада мною „сьвірг-цьвірг", „сьверг-цьверг!". Пракуда.

— А мне што сказаць, так сказаць? — уключылася вавёрка Кацюша. — Я, разумееце, радасна пераскокваю з дрэва на дрэва, а тут перапёлка — мык! — нада мною пралятае. Да таго як не засвірголіць!.. Я аднойчы нават звалілася з галіны на мох ад гэтага паветранага віравання ды невыснознага паклёпніцкага свіргату!

— А я ўвогуле свіргату не пераношу. Каб яго не чуць, мызу ў глебу зарыю, але колькі так можна вытрымаць?! — паскардзіўся барсук Барушчук.

— Ну, самі бачыце, — падагуліў Сандар Жоржавіч. — Прыйшоў час суняць гэтае непажаданае свіргатанне. Калі не перастануць, дык падстаўлю іх двухногім. І так праблема вырашыцца. Аднак, мая ласкавасць падказвае мне прыняць пакуль што больш далікатныя меры. Таму загадваю: ад сёння кожная перапёлка, якая ляціць нашым лесам, мае зачыніць дзюбу.

Мядзведзь на хвіліну змоўк, а потым пачаў раздумваць уголас.

— А, можа, даць загад і наконт іншага птаства?

Найбліжэйшы супрацоўнік Жоржавіча, праседжваючы на дубе дзяцел Стукач, замёр на хвіліну.

— І нават без „стуку-пуку"? — страпянуўся.

Сандар Жоржавіч, як заўсёды, рассакрэціў дзятлаву думку:

— Вядома, гэта не датычыла б „стуку-пуку".

Стукач уздыхуў з палёгкай і ў ягонай душы затрапяталі яшчэ большыя пашана ды ўдзячнасць да мядзведзя.

Тым часам змяя Ссапія, вуж Ззянон ды дзік Свіналыч абмяркоўвалі на ўскраіне лесу, што рабіць з новым Жоржавічавым указам. Вестка аб ім уміг даляцела да тройкі апазіцыянераў ад аднае з перапёлак, якая выпадкова пралятаючы над палянай пачула аб рашэнні ўселяснога кіраўніцтва.

— Трэба ўзяць перапёлак, так сказаць, пад нашы крылы, — вырашыла Ссапія.

— Ага, толькі што ў нас крылля няма! — са смехам заўважыў Свіналыч.

Ззянон глянуў на дзіка са спачуваннем наконт ягонага ўяўлення.

— Ну што, я толькі пажартаваў! — прабаваў тлумачыцца Свіналыч.

Змяя працягвала:

— Та-ак. Перапёлкі будуць нашым заплеччам. Пры нашай уладзе будуць свіргатаць колькі ўлезе. Так ім трэба патлумачыць.

Вуж і змяя адразу ўзяліся за дзейнасць. Толькі дзік застыў у одуме:

— Толькі што тое перапёлчае птаства зразумее з таго тлумачэння, з майго хрумкання? Я „хру", а яны — „цьверг-сьверг". Яны „цьверг", а я — „хру-хру". Трэба нам іншай мовы, такое „хрусьвергцьвярговай"!

МакХолад

ISSN 0546-1960